

АБ ЧЫМ ГАВАРЫЛІ КРАЯЗНАЎЦЫ

4

ДАЎЖНІКІ ЗА КАМУНАЛКУ ПЛАЦЯЦЬ ДВОЙЧЫ



МС

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

13 САКАВІКА 2020 г.
ПЯТНІЦА
№ 50 (29164)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар КАРПЕНКА, міністр адукацыі:**

*«Нам патрэбны новы падыход да арганізацыі ўзаемадзеяння ў прафарыентацыйнай рабоце. Прадстаўнікі прадпрыемстваў і арганізацый павінны ўзаемадзейнічаць з будучым абітурыентам, агучваць перспектывы развіцця свайго сектара эканомікі, канкрэтных арганізацый, паказваць перавагі прафесійнага выбару. Зараз прафарыентацыйнай работай у асноўным занятыя школа і сістэма прафесійнай адукацыі, але мы бачым, што трэба аб'ядноўваць намаганні».*

# Шпацыр па «Шляхецкай ваколіцы»



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Жыхар вёскі Гальшаны на Ашмяншчыне Вячаслаў РАПЕЦКІ са сваёй унучкай Марыяй прыехаў за дзесяць кіламетраў на колішні хутар Родзевічы, дзе цяпер месціцца аграсядзіба «Шляхецкая ваколіца», каб паглядзець макеты славутых помнікаў беларускага дойлідства, усталяваныя на падворку самой аграсядзібы.

## КОРАТКА

- **Конкурс на найлепшую юрыдычную ідэю праводзяць у Беларусі.**
- Праект па стварэнні альтэрнатыўных формаў пражывання людзей з інваліднасцю стартуе ў нашай краіне.
- **МАЗ прэзентаваў смеццявоз на газавым паліве.**



- Алімпійскі агонь Гульняў-2020 запалены ў Старажытнай Алімпіі.
- **«Белавія» з 14 сакавіка прыпыняе палёты ў Рым.**
- Нафтаправоды гатовыя да прапампоўкі азербайджанскай нафты з Украіны на Мазырскі НПЗ.
- **Тыдзень лесу пройдзе ў Беларусі з 28 сакавіка да 4 красавіка.**

Адукацыя

## ЦТ-2020: ПАРОГІ АДЗНАК

**Мінадукацыі вызначыла адзнакі, якія лічацца нездавальняючымі па выніках цэнтралізаванага тэсціравання. Гэта прадугледжана пастановай міністэрства № 16 ад 3 сакавіка, апублікаванай на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале.**

Па беларускай або рускай мове нездавальняючымі будуць лічыцца адзнакі ад 0 да 9 балаў (уключна), для спецыяльнасцяў філалагічнага профілю — ад 0 да 24.

Па першым прадмеце профільнага іспыту — матэматыцы, фізіцы, хіміі, біялогіі — да нездавальняючых прыраўнаваны адзнакі ад 0 да 19 балаў (уключна). Ніжняе парогавае значэнне адзнак па гісторыі Беларусі, сусветнай гісторыі (найноўшы час), грамадазнаўстве, геаграфіі, замежных мовах (англійскай, нямецкай, французскай, іспанскай, кітайскай) устаноўлена на ўзроўні ад 0 да 24 балаў (уключна).

Што да другога прадмета профільнага іспыту, дык па матэматыцы, фізіцы, хіміі і біялогіі нездавальняючымі будуць лічыцца адзнакі ад 0 да 9 балаў (уключна), па гісторыі Беларусі, сусветнай гісторыі (найноўшы час), геаграфіі, замежных мовах (англійскай, нямецкай, французскай, іспанскай, кітайскай) — ад 0 да 14 балаў (уключна).

Пры гэтым нездавальняючымі будуць лічыцца адзнакі ад 0 да 6 балаў пры наборы ў сілавыя ВНУ, якія знаходзяцца ў падпарадкаванні Мінабароны, МНС і Дзяржпагранкамітэта. Таксама гэтыя парогі закрануць ваенныя факультэты, спецыяльнасці «Вытворчасць, захоўванне і перапрацоўка прадукцыі раслінаводства», «Жывёлагадоўля, рыбаводства, пчалярства», «Сельскае будаўніцтва і ўладкаванне тэрыторый», «Меліярацыя і водная гаспадарка», «Аграінжынерыя». Гаворка ідзе аб такіх прадметах, як беларуская або руская мова, матэматыка, фізіка, хімія, біялогія, гісторыя Беларусі, сусветная гісторыя (найноўшы час), грамадазнаўства, геаграфія, замежныя мовы (англійская, нямецкая, французская, іспанская, кітайская).

На ЦТ-2019 ніжняе парогавае значэнне адзнак было аналагічнае.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Жыві і квітней, Беларусь! Маладосць на маршы

## «Жывыя» механізмы

У Гомелі распрацавалі першы адмысловы дапаможнік па аўтасервісе з дапоўненай рэальнасцю і перакладамі прафесійнай лексікі з нямецкай мовы



Фота Марыі АМЕЛІНАЙ.

СТАР. 3

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Ідзе падпіска на «Звязду» на II квартал 2020 года

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

З першых вуснаў

# «Калі сістэма функцыянуе, калі яна на нешта здольная і тым больш кіруемая, то і вынікі ёсць»

## Прэзідэнт правёў рабочую сустрэчу з міністрам аховы здароўя

**Вірусы прыходзяць і знікаюць, а клопат дзяржавы пра здароўе насельніцтва не мае абмежаванняў па часе. Таму на парадку дня — пытанні, якія будуць актуальныя і праз гады. Першае і галоўнае, што хвалюе кіраўніка дзяржавы, — кіруемасць сістэмы ў цэлым.**

«Кіруемасць заўсёды паказвае сябе, з'яўляецца лакмусавай паперкай у нейкіх неардынарных выпадках, як цяпер. Калі сістэма функцыянуе, калі яна на нешта здольная і тым больш кіруемая, то і вынікі ёсць. ***Няблага, канешне, працуе сістэма аховы здароўя ў краіне, і ўрачы малайчыны.*** Касякі ёсць, мы аб іх пагаворым. Яны, калі ёсць, — невялікія, чыста суб'ектыўнага характару. Значыць, у нашых сілах пазбягаць іх. Ну, яны, груба кажучы, не смяротныя», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

**• Дарэчы**

**Цікавіла Прэзідэнта і выкананне яго даручэння аб захаванні заработнай платы ўрачоў на ўзроўні, які быў да ўвядзення новага механізму налічвання.**

**«Гэта як база для далейшага павышэння. Наступным этапам мы будзем павышаць зарплату, каб да 2025 года забяспечыць двухразовы рост», — падкрэсліў міністр.**

**Дзякуючы новай сістэме аплаты працы, якая прадугледжвае магчымасць аператыўнага ўвядзення надбавак для медыцынскіх работнікаў, урачы на «перадавой» бацькоўскай дапамогі будуць істотна прастымуляваны матэрыяльна, адзначыў Уладзімір Каранік.**

Прэзідэнт не першы раз вяртаецца да пытання медыцынскага абсталявання і лекаў — перш за ўсё цэнаўтварэння і паставак. У свой час кошт імпартных прыбораў і медыкаментаў кіраўнік дзяржавы палічыў завышаным.

«Трэба было гэтыя цэны прыводзіць у пачуццё. І для гэтага не проста даваць рынку на водкуп — «рынак адрэгулюе»... Канкурэнцыя — справа добрая, але ўсё ж такі мы мусім ведаць мінімальныя, максімальныя цэны па тым ці іншым абсталяванні, асабліва дарагім (а мы іх ведаем), і старацца працаваць ніжэй за гэтыя цэны», — нагадаў задачу кіраўнік дзяржавы.



Фота БелТА.

Міністр аховы здароўя Беларусі Уладзімір Каранік пацвердзіў журналістам, што, калі ведамства пачало працаваць напрамую з вытворцамі, цэны і магчымасць закупкі абсталявання змяніліся па некаторых пазіцыях больш чым у два разы. Што да прастою няспраўнага абсталявання, спецыялісты спадзяюцца: калісьці ён будзе вымярацца не ў месяцах, а ў гадзінах.

Падчас размовы Прэзідэнт удзяліў увагу развіццю беларускай фармгаліны.

«Усе разумеюць, што эпідэміі прыходзяць і знікаюць, а лекавая бяспека мусіць быць. Цяпер многія краіны, якія не маюць запасаў лекавых сродкаў, таму што працавалі толькі па заказах на знешнія рынкі, забараняюць вываз антыбіётыкаў. Мы яшчэ раз правялі рэвізію: ***у нас дастатковая колькасць запасаў*** антыбактэрыяльных сродкаў. Мы выпускаем дэзінфіцыруючых сродкаў больш, чым нам неабходна, і сродкі індывідуальнай засцярогі», — праінфармаваў міністр.

Уладзімір Каранік далажыў кіраўніку дзяржавы, што з шэрагам кампаній праведзены перагаворы і падпісаны дагаворы аб лакалізацыі на нашых заводах інавацыйных прэпаратаў, якія знаходзяцца пад патэнтнай аховай.

### Для панікі няма падстаў

Не абышоў Прэзідэнт увагай і гучную тэму апошніх дзён — новую каранавірусную інфекцыю.

«Я разумею, што нам удалося спакойна прайсці гэты перыяд. ***Заспакойвацца, канешне, нельга, але і для панікі ў нас няма ніякіх падстаў.*** Ведаеце, людзі ж такія: калі ўлада штосьці гаворыць, значыць, нешта ёсць, давайце будзем рабіць па ўсялякі выпадак», — не хавае Аляксандр Лукашэнка.

Яшчэ на VIII з'ездзе Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі ён папрасіў суайчыннікаў не бегаць па аптэках, набываючы непатрэбныя лекі, не раскупляць маскі. Не ўсім парада дапамагла: пабеглі, раскупілі...

«Ну і што зараз? Зараз разумелі, што перанапружыліся... Ну купілі і купілі. Добра. Мы жартам абмяркоўвалі: прамысловасць паднялі нашу ў гэтай частцы. ***Маскі зараз шыюць некалькі прадпрыемстваў, сотні тысяч штук у суткі.*** Хай купляюць, калі камусьці трэба. Але зараз усе зразумелі, што маску трэба надзяваць на сябе, калі ў цябе ёсць праблема, каб не разносіць гэтую заразу», — сказаў лідар краіны.

Ён падзяліўся адчуваннямі, што ў гэты час у Беларусі заўсёды назіраецца пад'ём вірусных захворванняў. Разам з тым мы пакуль не адзначаем такой колькасці выпадкаў грыпу, як летась. Незразумелы новы вірус, вядома, выклікае насцярожанасць, але калі ахова здароўя працуе з чалавекам, вылечыца можна.

***«А калі ў капіталістычных краінах усё на капейцы замешана,*** чалавек захварэў — баіцца звярнуцца да ўрача, таму што ў яго няма гэтых 500 долараў заплаціць толькі за зварот. А яшчэ лячыцца... Гэта тысячы долараў. І часам людзі не атрымліваюць медыцынскай дапамогі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Адначасова Прэзідэнт нагадаў аб неабходнасці асабістай гігіены. Тут, як той казаў, на дзяржаву спадзявайся, а сам не рабі промаху.

«Людзі мусяць разумець, што ім хоць бы рукі-твар кожны дзень трэба мыць, прыводзіць сябе ў парадак. І ***калі ты ўжо адчуваеш, што ў цябе дзесьці нейкі вірус, ну пасядзі дома»,*** — мяркуе Аляксандр Лукашэнка. Дарэчы, Прэзідэнт амаль штодня асабіста цікавіцца ў міністра аховы здароўя становішчам па каранавірусе ў цэлым і станам хворых.

### Па плане «А»

***«Сітуацыя па-ранейшаму ў нашай краіне кантралюемая.*** Пацыенты, якія былі выяўлены, знаходзяцца ў здавальняючым стане. У чацвярых ужо ёсць адмоўныя тэсты, мы проста назіраем неабходны перыяд (па пратаколах гэта не менш за 14 дзён з моманту шпіталізацыі). Усе астатнія клінічныя сімптомы, нават у каго яны былі лёгкія, сышлі. Спадзяёмся, што ў найбліжэйшы час таксама атрымаем адмоўныя тэсты», — паведаміў журналістам кіраўнік ведамства.

Як адзначыў міністр, у сітуацыі з каранавірусам у медыкаў акрамя плана «А» ёсць планы «В», «С» і «D». Пакуль сістэма знаходзіцца на плане «А».

Уладзімір Каранік падкрэсліў, што сітуацыя з каранавірусам выявіла пэўныя праблемы ў грамадстве. У іх ліку — несвядомасць асобных грамадзян і залішняя шуміха. Баючыся ўмяшанняў у асабістае жыццё, людзі ўтойваюць факт наведвання эпідэмічна неспрыяльных раёнаў і позна звяртаюцца па медыцынскую дапамогу.

«Пацыент, які быў шпіталізаваны ў панядзелак у Мінску з пнеўманіяй у стане сярэдняй ступені цяжкасці, утаіў, што знаходзіўся ў паўночнай Італіі (таму што прыляцеў з Мюнхена). Каб не прапусціць выпадкі інфекцыі, ***усе пнеўманіі сярэдняй ступені цяжкасці і цяжкага цячэння абавязкова тэстуюцца на наяўнасць каранавіруса»,*** — сказаў міністр.

Ён выказаў удзячнасць кітайскім калегам за схему лячэння, якая лічыцца найбольш эфектыўнай. Інструкцыя даслана ва ўсе медустановы, падходы ўкаранёны. Пацыент пераведзены ў здавальняючы стан, дадаў міністр.

***«Чым пазней чалавек звернецца па медыцынскую дапамогу, тым даўжэй яму давядзецца лячыцца і тым вышэй шанц развіцця ўскладненняў»,*** — нагадаў кіраўнік ведамства.

У яго выклікае збянтэжанасць абыякавае стаўленне некаторых беларусаў да ўласнага здароўя і, што яшчэ больш дзіўна, — здароўя блізкіх, у тым ліку сталых бацькоў. Зразумець матывы людзей, якія вярнуліся з пэўнай краіны і кінуліся ў актыўныя сацыяльныя зносіны, складана.

«Ну, на працягу двух тыдняў можна ахоўны рэжым правесці? Абмяжаваць да мінімуму кантакты, не наведваць грамадскія месцы, не хадзіць у госці... Па-першае, даць свайму арганізму акліматызавацца, па-другое, абараніць людзей, з якімі маеш зносіны», — сказаў міністр.

### На два тыдні, да другога...

Пры ўмове свядомага стаўлення беларусаў да здароўя ў краіне стане выкарыстоўвацца алгарытм самаізаляцыі. Методыка будзе распрацавана ў найбліжэйшы час. Па-ранейшаму захоўваюцца карантынныя мерапрыемствы на мяжы і тыпаванне тых, хто прыязджае з неспрыяльных краін. Пры станоўчым тэсце высвятляюцца ўсе кантакты пацыента. Рост колькасці хворых адбываецца за кошт кантактаў, якія ўжо былі ізаляваны. Уладзімір Караніk растлумачыў, што гэта доказвае эфектыўнасць працы.

«Нагоды для панікі няма. Каранавірусная інфекцыя, як і любая іншая, развіваецца па сваіх эпідэміялагічных законах. У нас быў SARS — гэта таксама каранавірус, у нас быў MERS — таксама каранавірус. ***З цягам часу агрэсіўнасць віруса падае.*** У папуляцыі распаўсюджваюцца штамы, якія выклікаюць лёгкае недамаганне», — падкрэсліў міністр.

Нагадаў ён і пра яшчэ адно правіла, якое дзейнічае на нашу карысць: чым пазней краіна ўвойдзе ў эпідэміялагічны пад'ём, тым лепш.

Кіраўнік дзяржавы згадзіўся з неабходнасцю абмежаванняў на правядзенне масавых мерапрыемстваў. ***Міністэрства аховы здароўя рэкамендуе правядзенне культурна-масавых мерапрыемстваў абмежаваць на час, пакуль супакоіцца эпідэмічнае становішча*** і стане зразумела, як развіваецца сітуацыя ў нашых суседзяў.

Уладзімір Каранік патлумачыў журналістам, што падыход да кожнай імпрэзы будзе індывідуальны. Напрыклад, мерапрыемства на свежым паветры можа сабраць і 600 чалавек — там мінімальная пагроза заражэння. У цесным пакоі не варта збіраць і сотні чалавек, асабліва на доўгі час.

«Што да школ, і ЮНІСЕФ, і СААЗ не рэкамендуюць (закрываць установы. — **«Зв.»**), паколькі дзеці не адносяцца да групы рызыкі. Адзінае, калі дзіця хварэе, не трэба яго весці ў калектыў і «трэніраваць» такім чынам імунітэт», — дадаў міністр.

**Варвара МАРОЗАВА.**

Блізкая ўлада

## ТЭЛЕФАНУЙЦЕ — ВАМ АДКАЖУЦЬ

**Традыцыйна па суботах аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам праводзяцца прамыя ліній ў мэтах павышэння эфектыўнасці работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, папяратворчасці, а таксама для аператыўнага рашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей.**

Тэлефонныя лініі ў суботу, 14 сакавіка, з 9.00 да 12.00 правядуць:

- намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Вадзім Іванавіч АЛЬШЭЎСКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;
- намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Мікалаевіч БЕЛАВУС. Тэл. 8 021 222 22 22;
- старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь Міхайлавіч САЛАВЕЙ. Тэл. 8 023 233 12 37;
- намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Іосіфавіч ДЗЯШКО. Тэл. 8 015 273 56 44;
- кіраўнік спраў Магілёўскага аблвыканкама Рыгор Аляксандравіч ВАРОНІН. Тэл. 8 022 250 18 69;
- намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Мікалай Міхайлавіч РАГАШЧУК. Тэл. 8 017 500 41 60;
- першы намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Фёдар Віктаравіч РЫМАШЭЎСКІ. Тэл. 8 017 222 44 44.

# ЗАРАДЖАЙСЯ, ПАЕХАЛІ

**Прэзідэнт падпісаў указ аб стымуляванні выкарыстання электрамабіляў.**

Праект указа быў унесены на разгляд на нарадзе кіраўніка дзяржавы з кіраўніцтвам Савета Міністраў у панядзелак. Як паведамляе прэс-служба Прэзідэнта, новы ўказ прадугледжвае меры, якія прызначаны стымуляваць попыт на электрамабілі, стварэнне ў краіне адпаведнай зараднай і сэрвіснай інфраструктуры.

У прыватнасці, уладальнікі электрамабіляў вызваляюцца ад выплаты пошліны за выдачу дазволу на допуск да ўдзелу ў дарожным руху. Фізічным асобам не давядзецца выплачваць ПДВ пры ўвозе ў Беларусь электрамабіляў для асабістага карыстання. Пры гэтым у іх будзе магчымасць вярнуць выплачаную пры набыцці электрамабіля суму ПДВ у межах 500 базавых велічынь. Акрамя таго, уладальнікі электратранспарту вызваляюцца да 1 студзеня 2026 года ад платы за паркоўку ў спецыяльна абсталяваных месцах на камунальных аўтамабільных паркоўках.

Вытворцы электрамабіляў і электразарадных станцый, а таксама арганізацыі, якія іх эксплуатуюць, атрымалі права прымяняць павышаны інвестыцыйны вылік у парадку, устаноўленым Падатковым кодэксам. Вызвалены ад ПДВ зарадныя станцыі ў выпадку іх выкарыстання ў Беларусі.

Вытворчаму аб'яднанню «Беларуснафта» без правядзення аўкцыёну будуць дадзены ў арэнду зямельныя ўчасткі для будаўніцтва і абслугоўвання электразарадных комплексаў. Пры гэтым затраты на будаўніцтва зарадных станцый могуць бязвыплатна перадавацца на баланс юрыдычнай асобы, на ўліку якой знаходзяцца гэтыя аб'екты, і ўключацца заказчыкам (забудоўшчыкам) у склад пазарэалізацыйных расходаў.

# «Жывыя» механізмы

**Навучальны дапаможнік «Нямецкая мова для прафесійных зносін. Аўтасэрвіс. Практыкум» распрацавалі выкладчыкі Гомельскага дзяржаўнага прафесійнага аграрна-тэхнічнага ліцэя Святлана Мароз і Таццяна Кузьмянкова. Цяпер яго рэкамендуе да выкарыстання Рэспубліканскі інстытут прафесійнай адукацыі.**



Фота Марыі АМЕЛІНАЙ.

**Намеснік дырэктара па навучальнай рабоце УА «Гомельскі дзяржаўны прафесійны аграрна-тэхнічны ліцэй» Святлана МАРОЗ.**

Новая кніга — гэта крыху больш за 200 старонак з інфармацыяй, якая вучыць будучага аўтаслесара ці кіроўцу разбірацца ва ўнутраных працэсах транспартнага сродку і прынцыпах работы механізмаў. Больш за тое, дапаможнік дае магчымасць зразумець, як тую ці іншую праблему з машынай вырашаюць нямецкамоўныя калегі.

— Мабільную адукацыю мы разглядаем не як адмену традыцыйных практык, а як новую магчымасць іх рэалізацыі, — расказвае аб перадумовах стварэння кнігі з віртуальным складнікам **намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце ўстановы і адна з аўтараў Святлана МАРОЗ.** — Такія праекты арыентаваны перш за ўсё на патрэбы новага часу. У нашым жа выпадку найперш мы апрабавалі новы нямецкамоўны дапаможнік на вучэбных занятках, але сутыкнуліся з пытаннем: "Як нашы навучэнцы могуць замацоўваць і ўдасканальваць веды, навыкі, уменні па-за сценамі ліцэя — напрыклад, дома ці ў дарозе?».

**Выкладчык ліцэя Надзея САРЫЕВА** дапамагла зрабіць наступны крок — распрацавала мабільную праграму, якая падмацоўвае тэкставы матэрыял падручніка. І гэта даступна для навучэнцаў у любы зручны для іх час.

— Усё вельмі проста, — тлумачаць выкладчыкі, — мабільную прыладу ці планшэт трэба паднесці да адпаведнага QR-кода — і, так бы мовіць, у адзін клік агрэгаты, вузлы «ажываюць». Развіваецца прасторавае мысленне навучэнцаў, эфектыўна паляпшаецца ўспрыманне і разуменне работы механізмаў.

Вучэбныя заняткі не толькі даюць магчымасць атрымаць карысную інфармацыю, але і становяцца вельмі цікавыя.

— У пачатак кожнай тэмы выносіцца пэўнае праблемнае пытанне, якое выканана ў выглядзе малюнка з элементамі дапоўненай рэальнасці, — звяртае ўвагу **аўтар Таццяна КУЗЬМЯНКОВА.** — Навучэнцы падносяць да яго гаджэт і па сродках візуалізацыі разбіраюцца ў нюансах. Дапаможнік змяшчае таксама тэматычны слоўнік лексічных адзінак, пераклады тэхнічных тэкстаў, практыкаванні для трэніроўкі і самакантролю, аўдыя- і відэаматэрыялы, агучаныя носьбітамі мовы.

У канцы выдання — нямецка-рускі слоўнік, пералік мультымедыйнага кантэнту для навігацыі і хуткага пошуку патрэбных тэрмінаў. Усё гэта ў сукупнасці спрацоўвае на тое, каб «абудзіць» інтарэс і нестандартна падаць новыя веды для засваення.

Дарэчы, дапаможнік — актуальная альтэрнатыва для навучальных устаноў, якія не заўсёды могуць дазволіць сабе набыць і выкарыстоўваць дарагія сучасныя тэхнічныя сродкі навучання. Тым часам мабільны тэлефон сёння даступны кожнаму навучэнцу.

Выкладчыкі Гомельскага дзяржаўнага прафесійнага аграрна-тэхнічнага ліцэя нестандартна падышлі і да прэзентацыі сваёй распрацоўкі: па сродках прамой трансляцыі ў сеціве аўтары прадэманстравалі калегам з усёй Беларусі, як канкрэтна выкарыстоўваюць інфармацыйныя тэхналогіі на занятках.

— У стварэнні дапаможніка сапраўды была неабходнасць, — кажуць аўтары. — Сёння актыўна развіваецца аўтамабілебудаванне, укараняюцца ў вытворчасць дасягненні навукі і тэхнікі, пашыраюцца інтэрнацыянальныя сувязі. Веданне замежных моў становіцца неабходнае не толькі для інжынераў, але і для кваліфікаваных рабочых: кіроўцаў, слесараў, аўтаперавозчыкаў. Калі для навучання па спецыяльнасці «Эксплуатацыя і рамонт аўтамабіляў» па англійскай мове ёсць выбар вучэбных дапаможнікаў, то па нямецкай іх недастаткова.

Група, у якой займаюцца па новым дапаможніку ў ліцэі, — гэта 30 навучэнцаў. Ім для заняткаў выдалі планшэты. Многія ў будучыні мараць працаваць у сферы міжнародных перавозак. Вядома, для гэтага, напрыклад, уменне размаўляць з механікам на яго роднай мове дакладна спатрэбіцца. Праўда, найперш хлопцам яшчэ трэба будзе здаць экзамен на адпаведную катэгорыю і набрацца вопыту на беларускіх магістралях. Усе без выключэння выпускнікі будуць працаўладкаваны ў мясцовыя аўтакалоны.

Між тым **метадыст ліцэя Лілія РУЦКАЯ** падкрэслівае, што на працягу апошніх сямі гадоў Гомельскі дзяржаўны прафесійны аграрна-тэхнічны ліцэй — рэспубліканская інавацыйная пляцоўка, на якой паспяхова рэалізуюцца перспектыўныя эксперыментальныя і інавацыйныя праекты.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### ЗША забараняюць уезд з Еўропы

З сённяшняга дня на 30 дзён у Злучаных Штатах уводзяць забарону на ўезд у краіну замежнікаў, якія прыбываюць з еўрапейскіх дзяржаў (выключэнне будзе зроблена толькі для Вялікабрытаніі). Пра гэта заявіў прэзідэнт ЗША Дональд Трамп, выступаючы ў сераду ўвечары з тэлезваротам да суграмадзян у сувязі з распаўсюджваннем у краіне і свеце новага каранавіруса, паведамляе ТАСС. «Новыя правілы ўступаюць у сілу ў пятніцу ў поўнач, — сказаў Дональд Трамп. — Выключэнні будуць зроблены для амерыканцаў, якія праходзяць адпаведную праверку. Абмежаванні таксама не будуць распаўсюджвацца на Вялікабрытанію».




Акрамя таго, прэзідэнт ЗША адзначыў, што амерыканская адміністрацыя разгледзіць магчымасць больш ранняй, чым планавалася, адмены абмежаванняў на ўезд у краіну асоб з КНР і Рэспублікі Карэя. «Мы сочым за сітуацыяй у Кітаі і Рэспубліцы Карэя. Па меры таго як сітуацыя там паляпшаецца, мы правядзём пераацэнку абмежаванняў, якія дзейнічаюць у дачыненні да іх у цяперашні час», — сказаў ён.

### Вялікабрытанія інвестуе 600 мільярдаў фунтаў у росквіт пасля брэксіту

Улады Вялікабрытаніі маюць намер у наступныя пяць гадоў інвеставаць у будучы росквіт краіны больш за 600 мільярдаў фунтаў стэрлінгаў, што ў тры разы больш, чым за апошнія 40 гадоў. Аб гэтым заявіў брытанскі міністр фінансаў, канцлер Рышы Сунак, прадстаўляючы праект бюджэту ў парламенце. Паводле яго слоў, дзейны



ўрад мае намер закласці падмурак для «новага стагоддзя росквіту» краіны. «Чыстыя дзяржаўныя інвестыцыі ў рэальным выражэнні будуць самымі высокімі з 1955 года», — заўважыў міністр. Раней Кабмін Брытаніі паведамляў, што праект бюджэту, які быў прадстаўлены ў парламенце, стане адным з самых амбіцыйных у гісторыі і будзе ўлічваць эканамічныя наступствы выхаду краіны з ЕС.

### Улады Афганістана вызваляць 1,5 тысячы талібаў

Прэзідэнт Афганістана Ашраф Гані падпісаў указ, згодна з якім улады вызваляць 1,5 тысячы членаў арганізацыі «Талібан». Пра гэта паведамляе Reuters са спасылкай на дакумент, копія якога ёсць у выдання. На тое, каб вызваліць талібаў, спатрэбіцца 15 дзён, штодня з турмаў Афганістана будуць выходзіць па сто чалавек, паведамляе Reuters. Усе вызваленыя павінны будуць падаць «пісьмовае абавязацельства не вяртацца ў зону баявых дзеянняў», гаворыцца ва ўказе. Працэс вызвалення талібаў пачнецца на працягу некалькіх дзён. Ва ўказе, падпісаным Гані, гаворыцца, што, калі перамовы будуць працягвацца паспяхова, улады стануць адпускаць па 500 чалавек кожныя два тыдні да таго часу, пакуль не будзе вызвалена абумоўленая колькасць членаў арганізацыі. Гэта адна з умоў здзелкі, заключанай паміж ЗША і «Талібанам», якая павінна запусціць мірны працэс у Афганістане. Раней Злучаныя Штаты пачалі вывад сваіх войскаў, што з'яўляецца яшчэ адной умовай пагаднення.



## На слыху

# У БДУ праводзяцца санітарна-эпідэміялагічныя мерапрыемствы

**Учора стала вядома, што ў Белдзяржуніверсітэце праводзяцца санітарна-эпідэміялагічныя мерапрыемствы і апрацоўка «кантактаў другога ўзроўню».**

— Група студэнтаў, так званыя «кантакты другога ўзроўню», накіравана ў шпіталь ветэранаў ВАВ для тэсціравання на COVID-19. Захварэлых сярод студэнтаў няма. Універсітэт працуе ў звычайным рэжыме, ніякай новай хвалі каранавіруса ў Беларусі няма, — пракаментавала **прэс-сакратар Міністэрства аховы здароўя Юлія БАРАДУН.**

Як стала вядома, гэта студэнты факультэта міжнародных адносін.

Тым часам санітарна-эпідэміялагічныя мерапрыемствы праводзяцца і ў 20-й сталічнай гімназіі. Бацька адной школьніцы з дыягназам COVID-19 знаходзіцца ў стацыянары. Урокі адменены ў васьмі класах гімназіі, у астатніх скарочаны да паўгадзіны.

— Паабяцалі, што заўтра ўрокі таксама будуць скарочаны: дзве гадзіны вучымся, а потым на 30 хвілін усе выходзім на вуліцу і дыхаем свежым паветрам. А ўсе памяшканні праветрываюць, — расказалі ўчора ў гімназіі.

Юлія Барадун пацвердзіла, што заняткі ў 8-м класе 20-й гімназіі пакуль перапынены на адзін, сённяшні, дзень.

## Полюс холаду

# Зазірнулі на 20 тысяч гадоў таму

**Супрацоўнікі 12-й Беларускай антарктычнай экспедыцыі (БАЭ) адабралі рэкордны палеагеаграфічны керн — узор горнай пароды, выняты са свідравіны з дапамогай спецыяльна прызначанага для гэтага віду бурэння. Пра гэта паведамляе з Паўднёвага полюсу Зямлі начальнік БАЭ Аляксей ГАЙДАШОЎ.**



У рамках навуковай праграмы па даследаванні змяненняў прыроднага асяроддзя і клімату Зямлі Эндэрбі пад уплывам антрапагенных і прыродных фактараў у раёне Беларускай антарктычнай станцыі на возеры Ніжняе праводзіліся работы па адборы палеагеаграфічнага керну. Па арыгінальнай методыцы, распрацаванай Аляксеем Гайдашовым і яшчэ адным членам экспедыцыі Аляксеем Хаткевічам, з комплексным выкарыстаннем тэхналагічнага абсталявання і спецыяльнага рыштунку ўдалося дастаць рэкордны для гэтага рэгіёна Арктыды керн з поўным вертыкальным разрэзам бактэрыяльных матаў і донных адкладаў аж да падсцілаючых карэнных горных парод, якія ўтвараюць першаснае ложа возера Ніжняе. Вышыня напаўнення калонкі керну — 1 м 95 см, арыенціровачны ўзрост ніжняй яго часткі можа складаць ад 14 да 20 тысяч гадоў.

Вывучэнне здабытага ўзору дазволіць скласці карціну фізіка-геаграфічных умоў геалагічнага мінулага і прыродна-кліматычнага развіцця гэтага рэгіёна Антарктыды ў наш час. Па рэкамендацыях расійскіх і беларускіх спецыялістаў пасля адбору керну была праведзена яго глыбокая замарозка. Для часовага захоўвання ў раёне ледніка Хейса абсталявана лядовая штольня.

Вялікую зацікаўленасць у сумеснай рабоце па вывучэнні ўнікальнага навуковага матэрыялу выказалі расійскія спецыялісты Арктычнага і антарктычнага навукова-даследчага інстытута Расгідрамета і Інстытута геаграфіі Расійскай акадэміі навук. У цяперашні час распрацоўваецца пытанне транспартна-лагістычнай схемы па бяспечнай транспарціроўцы керну.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў выказваюць глыбокае спачуванне намесніку старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Петрашовай Вользе Уладзіміраўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

Адкрыты дыялог

# РАЗВІЦЦЁ ІНТЭРНЭТУ ВАЖНА ПАШЫРАЦЬ

**Актуальны фармат сённяшняга папяровага выдання, стварэнне моцных рэдакцый, запатрабаванасць у мультымедыйных прадуктах, абарона гістарычнай памяці і лёс друкаванай кнігі... На гэтыя і іншыя аспекты развіцця медыяпрасторы і выдавецкай справы міністр інфармацыі Беларусі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ звярнуў увагу падчас наведвання Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны. Сустрэча ў фармаце адкрытага дыялогу з выкладчыкамі і студэнтамі ВНУ прайшла ў межах адзінага дня інфармавання.**

Адна з тэм, якую закранулі студэнты-філолагі, датычылася падтрымання цікавасці да папяровых выданняў. Міністр падкрэсліў, што сёння на медыяпрасторы для газет важна стварыць моцную рэдакцыю, якая акрамя традыцыйнага папяровага фармату паралельна павінна мець канкурэнтаздольны прадукт у інтэрнэце.

Адказваючы на пытанні студэнтаў, Аляксандр Карлюкевіч звярнуў увагу на тое, што зараз рэдакцыя кожнага СМІ павінна быць камунікатыўным цэнтрам і выкарыстоўваць самыя розныя фарматы для наладжвання кантакту з чытачом: не толькі на паперы, але і, перш за ўсё, у сацыяльных сетках. Пры гэтым на стварэнне пэўнага стылю і пазіцыянаванне светапогляду рэдакцыі павінен працаваць увесь калектыў.

Дарэчы, прагучала думка і аб тым, што папяровае выданне — гэта папулярны і перспектыўны фармат для агучвання поглядаў і прагнозаў экспертаў у сферах эканомікі, сацыяльнага развіцця і навукі, для аналітычных высноў прадстаўнікоў аўтарскай журналістыкі. Гэта, на думку міністра інфармацыі, і ёсць адказ на пытанне: як сучаснай газеце ўтрымаць чытача? На сустрэчы закранулі і пытанне пашырэння колькасці інфармацыйных рэсурсаў у інтэрнэце:

— Канешне, сёння асноўная медыйная нагрузка, калі казаць пра ўплыў на грамадства, прыходзіцца на сацыяльныя сеткі і інтэрнэтрэсурсы, — адзначыў Аляксандр Карлюкевіч. — Улічваючы сучасныя рэаліі, перакананы, што СМІ павінны скіраваць свой погляд на стварэнне разнастайных прадуктаў для інтэрнэт-прастораў і сеткавых рэсурсаў. Зараз для гэтага існуюць усе ўмовы.

А вось распаўсюджванне беларускага друкаванага слова міністр інфармацыі бачыць у тым ліку і дзякуючы пашырэнню работы з пазаштатнымі аўтарамі: не прафесійныя журналісты, але моваўнаўцы, настаўнікі, гісторыкі і ўсе, хто ведае і любіць роднае слова, могуць стаць у газетах новымі імёнамі.

Студэнтам было цікава даведацца, якім Аляксандр Карлюкевіч бачыць лёс друкаванай кнігі і якія з апошніх выданняў лічыць цікавымі для чытачоў? Адзначым, што сярод шэрагу друкаваных праектаў міністр інфармацыі адзначыў кнігу «Кветкавы край Беларусі». Аўтары выдання — паэт Леанід Дранько-Майсюк і фотамастак нашага выдання Анатоль Кляшчук на працягу дзесяцігоддзяў збіралі матэрыял, каб паказаць вялікаму свету невядомую прыгажосць Беларусі, якую варта захаваць.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

Наш фармат

# ЧАСТКІ ЦЭЛАГА



**У Мінску на пляцоўках Нацыянальнага гістарычнага музея праходзіць І Рэспубліканскі краязнаўчы форум. Паводле слоў старшыні Беларускага фонду культуры Тадэвуша Стружэцкага, сёлетні форум — самы прадстаўнічы з усіх, што праходзілі за апошнія дзесяцігоддзі. Удзел у маштабным мерапрыемстве, прысвечаным Году малой радзімы, бяруць каля 230 энтузіястаў і прафесійных даследчыкаў мясцовай гісторыка-культурнай спадчыны: супрацоўнікі музеяў і бібліятэк, журналісты і літаратары, гісторыкі, педагогі, студэнты і школьнікі з розных рэгіёнаў краіны.**

«Чалавек як істота біялагічная не вечны, ён мае свой пачатак і канец. А вось даследчык, той, хто піша, жыве да таго часу, пакуль жывое яго праца, яго тэксты. Я хачу пажадаць кожнаму з нас, каб у вечнасці засталіся тыя словы пра гісторыка-культурную спадчыну Беларусі, якія сапраўды вартыя захавання і папулярызацыі, — звярнуўся да даследчыкаў **старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы і культуры Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, доктар гістарычных навук Ігар МАРЗАЛЮК.** — Для гэтага трэба, каб мы пазбавіліся комплексаў мізэрнасці і правінцыйнасці і памяталі, што за нашымі плячыма — вялікая традыцыя, вялікая гісторыя і кожны з нас мусіць яе любіць, шанаваць і тыражаваць везды аб ёй».

Учора ўдзельнікі форуму прадставілі шматлікія ініцыятывы і праекты, якія ўжо рэалізаваны ў рэгіёнах дзеля захавання культурнай, прыроднай спадчыны і гістарычнай памяці, падзяліліся назапашаным вопытам і нявырашанымі праблемамі, абмеркавалі выхаваўчы патэнцыял краязнаўства ва ўстановах адукацыі, шмат спрачаліся пра ўзаемадзеянне розных структур у краязнаўчым кірунку. Сёння праца на розных музейных пляцоўках працягнецца. Напрыканцы планууецца прыняць рэзалюцыю, якая падвядзе вынікі першага і акумулюе найбольш цікавыя ідэі і прапановы на наступныя краязнаўчыя форумы. Акрамя таго, адбудзецца цырымонія ўзнагароджання лаўрэатаў і пераможцаў конкурсу краязнаўчай літаратуры за 2017—2019 гады. Арганізатары творчага спаборніцтва атрымалі больш як 200 работ, сярод якіх ёсць і навуковыя даследаванні, і фотаальбомы, і творы мастацкай літаратуры, і цэлыя кніжныя выдавецкія серыі. Экспертная рада вызначыла найлепшыя работы ў намінацыях, прысвечаных Году малой радзімы (яны, дарэчы, сталі адным з самых масавых), 75-годдзю Вялікай Перамогі, у катэгорыі «Мой род, мая краіна» і ў намінацыі, прысвечанай асобным арганізацыям, прадпрыемствам, школам. Таксама адначу з краязнаўцаў будзе ўручаны Гран-пры конкурсу ад Міністэрства інфармацыі Беларусі.



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Арганізатары краязнаўчага форуму спадзяюцца, што распачатая ініцыятыва атрымае працяг у іншых праектах. У прыватнасці, намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Алесь Суша запрасіў краязнаўцаў на вялікі міжнародны кангрэс, прысвечаны праблематыцы краязнаўства, які адбудзецца ў кастрычніку і абяцае сабраць прадстаўнікоў не менш чым з 10 краін.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Надвор'е

## МІНУС 10 — АМАЛЬ ЗІМА?

### У СУБОТУ І НЯДЗЕЛЮ Ў НАС ПАЎСЮДНА ЎСТАЛЮЕЦЦА СНЕЖНАЕ ПОКРЫВА. НЯЗНАЧНАЕ, АЛЕ ЎСЁ Ж...

**У мінулыя тры месяцы мы і марозу не бачылі. Прыйшла вясна і прынесла ў найбліжэйшыя выхадныя пахаладанне і ў многіх раёнах краіны ападкі ў выглядзе снегу, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У суботу чакаецца перамяшчэнне праз тэрыторыю краіны халоднага франтальнага падзелу. Замест цяпла ён прынясе снег і мароз, а надвор'е вернецца ў сваю кліматычную сакавіцкую норму. Моцны парывісты паўднёва-заходні вецер зменіцца на паўночны, а тэмпература паветра на працягу сутак чакаецца ў асноўным ад мінус 3 градусаў да плюс 4 градусаў, толькі па паўднёвым усходзе будзе на пару градусаў цяплей. У многіх раёнах пройдуць ападкі, у асноўным мокры снег, таму ўсталюецца нязначнае снежнае покрыва. На асобных участках дарог прагназуецца галалёдзіца.

У ноч на нядзелю адаб'ецца ўплыў няўстойлівай паветранай масы. А ўдзень надвор'е будзе вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску, сфарміраваная ў халодным паветры. Таму чакаецца воблачна з праясненнямі. Уначы месцамі, у асноўным па паўднёва-ўсходняй палове краіны, пройдзе кароткачасовы снег — такі, якога мы чакалі зімой.

Удзень будзе суха. На асобных участках дарог — галалёдзіца. Па ўсходзе Беларусі захаваецца парывісты паўночна-заходні вецер, на астатняй тэрыторыі вецер пачне павольна сціхаць. Тэмпература паветра ўначы будзе ад мінус 4 да мінус 9 градусаў, у дзённыя гадзіны — ад мінус 1 градуса да 5 цяпла, па захадзе — да плюс 7 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у панядзелак надвор'е працягне вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску, сфарміраваная ў халодным паветры, толькі ў дзённыя гадзіны ў паўднёва-заходніх раёнах адаб'ецца ўплыў франтальнага падзелу. Чакаецца пераменная воблачнасць, пераважна без ападкаў, толькі ўдзень на паўночным захадзе краіны магчымы кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Уначы і раніцай на асобных участках дарог будзе галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы — ад нуля да мінус 7 градусаў, пры праясненнях — да мінус 8—10 градусаў. Удзень паветра прагрэецца да плюс 3—10 градусаў, па Брэсцкай вобласці — да плюс 12 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Будзь у курсе!

## АДКРЫВАЕЦЦА ПАЛЯВАННЕ НА ПТУШЫНУЮ ДЗІЧЫНУ

**З другой суботы сакавіка (14-е чысло) у Беларусі пачынаецца веснавы сезон палявання на птушыную дзічыну. Па другую нядзелю мая (10-е чысло) дазваляецца ружэйнае паляванне на пралётных гусей (шэрую, белалобую, гуменніка), канадскую казарку, а таксама на самцоў (качароў) качак (крыжанкі, свіязі, гогаля, шыраканоскі, чырвонагаловай і чубатай чарнеці, чыркоў — свістунка і траскунка, шэрай качкі. Паляванне дазваляецца ў светлы час сутак, акрамя перыяду з 12 да 18 гадзін, нагадалі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.**

Дазволеныя спосабы палявання на гусей: ружэйны (гладкаствольная паляўнічая зброя з патронамі са шротам) з засады толькі са скрадка (альбо з засады з выкарыстаннем маскіровачнага халата) і толькі з падманваннем з дапамогай манка і падсаднога гусака (гусей), і (або) профіляў, і (або) чучала гусака.



ohotabelarus.by

Дазволеныя спосабы палявання на качак: ружэйны (гладкаствольная паляўнічая зброя з патронамі са шротам) з засады толькі са скрадка (або з выкарыстаннем маскіровачнага халата) і толькі з падманваннем з дапамогай падсадной качкі (качак), і (або) чучала (чучалаў), і манка.

У веснавы сезон палявання на гусей ці качароў качак дапускаецца выкарыстанне замест скрадка маскіровачнага халата (маскіровачнага касцюма), надзетага на паляўнічага, які забяспечвае яго непрыкметнае для паляўнічых жывёл знаходжанне ў паляўнічых угоддзях (маскіроўку).

Для вышуку і падачы здабытай дзічыны можна выкарыстоўваць паляўнічых сабак: тэр'ераў, такс, лягавых, спаніэляў, рэтрывераў, водных сабак.

Агульная працягласць веснавога сезона палявання на гусей і качак не павінна перавышаць 28 дзён (паляўнічых) на працягу дазволенага перыяду, за выключэннем палявання на паляўнічых турах. Веснавы сезон палявання на гусей і качак у рамках правядзення апошніх доўжыцца з другой суботы сакавіка па другую нядзелю мая.

Існуе пералік паляўнічых угоддзяў, на тэрыторыі якіх забараняецца паляванне на асобныя віды птушак у веснавы сезон. Азнаёміцца з ім можна на сайце Дзяржінспекцыі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**




## КАБ НЕ ТОЙ «ХЛАПЕЦ»...

Было гэта ў тыя даўнія гады, калі я скончыла школу, калі перада мной паўстала пытанне аб выбары прафесіі.

З маленства, як толькі навучылася чытаць, я марыла стаць пісьменніцай. Але ж марыць — гэта адно, а вось для таго, каб стаць, трэба, як той казаў, вучыцца, вучыцца і яшчэ раз вучыцца.

У нашым Віцебскім педінстытуце ні філфака, ні журфака тады не было. Адправіць мяне на вучобу ў іншы горад мама не магла (проста не мела за што, бацька загінуў на фронце). Значыць, я мусіла заставацца дома, паступаць на нейкі іншы факультэт, напрыклад — на хіміка-біялагічны, хоць конкурс там быў — мама не гаруй: 11 чалавек на месца!

І вось экзамены. Тры першыя я ўжо здала, прычым паспяхова. Перад апошнім — хіміяй — спынілася, помню, у вестыбюлі, ля дошкі аб'яў, нешта прачытала там, а заадно падслухала, як дзяўчына (мая равесніца) супакойвае хлопца: кажа, што ён абавязкова паступіць, калі, вядома ж, не будзе хвалявацца, панікаваць.

Я таксама захацела падбадзёрыць таго юнака: сказала, што баяцца яму няма чаго, што хлопцаў у настаўнікі наогул бяруць без конкурсу...

Гэтыя мае словы зацікавілі, відаць, яшчэ аднаго кандыдата ў студэнты, праўда, трохі старэйшага. Ён спыніўся побач — уважліва прыслухоўваўся, ва ўсе вочы глядзеў...

— Што — таксама хвалюешся? — загаварыла з ім я. — Таксама душа ў пяткі зайшла?

— З чаго б гэта? — не зразумеў хлопец.

Але я, не заўважыўшы гэтага, гнула сваё:

— Не трэба хвалявацца. Здасі ты экзамен, паступіш! Павер мне! — запэўніла хлопца і, паляпаўшы яго па плячы, выйшла на вуліцу.

Той юнак (я азірнулася) прайшоў трохі следам і спыніўся на ганку — паглядзеў мне ўслед. «Ну і няхай, не ты ў гэтым першы, не ты і апошні», — падумала я.

...І вось назаўтра экзамен. На пытанні білета я адказваю добра — падводзіць задача. Ды як? Сорамна прызнацца: ад 14 я аднята 2 і, расхваляваўшыся, атрымала тыя ж... 14! А перад жанчынай, што прымала экзамен, ляжыць правільны адказ — 12. Яна, што называецца, бачыць розніцу і...

І тут адчыняюцца дзверы — на парозе з'яўляецца той самы... «хлопец», што ўчора глядзеў мне ўслед.

— Алена Паўлаўна, — звяртаецца ён да маёй экзаменатаркі, — вы яшчэ не закончылі? А я сваю групу ўжо адпусціў. Правяраў рашэнні задач — па іх адразу відаць, хто чаго варты.

— Ваша праўда, Яўген Віктаравіч! І якраз жа дарэчы, — згадзілася з ім каляжанка. — Вось паглядзіце: гэта дзяўчына (выкладчыца паказала на мяне) выдатна адказала на пытанні, а ў задачы зрабіла памылку. Не ведаю, як і быць. Можа, параіце?

Яўген Віктаравіч уважліва паглядзеў на мяне. Засмяяўся (а мне хоць пад стол спаўзай ад страху і сораму!), узяў з маіх рук паперку з рашэннем задачы, паглядзеў і ціха сказаў:

— Э-э, ды тут «вышэйшая матэматыка»... 14 мінус 2 колькі будзе?

— 12, — нейкім незнаёмым голасам прамовіла я.

— А ў вас? 14! Вам у школу трэба ісці, у першы клас...

— Не, — кажу ледзь чутна, — мне ў інстытут трэба.

— Ну тады давайце прадоўжым экзамен, — прапануе Яўген Віктаравіч. — Напішыце мне формулу суперфасфату.

Я хуценька пішу.

— Гляньце, ведае! — са смехам здзіўляецца выкладчык. І ўжо на адрас каляжанкі дадае. — Вось бачыце, Алена Паўлаўна, задачу дзяўчына рашыла правільна, на пытанні — вы казалі — таксама выдатна адказала, значыць і паставіць ёй трэба «выдатна»!

...Карацей, праз дзень на дошцы аб'яў вісеў спіс першакурснікаў. У групе № 12 я знайшла сваё прозвішча. Насупраць яго нейчай рукой было пазначана красамоўнае: «Староста».

Праляцелі гады вучобы... І нават дзесяцігоддзі працы ў школе.

Неяк выпускнікі зрабілі мне сюрпрыз — праз часопіс павіншавалі з днём народзінаў і падпісаліся: «Вашы вучні — розныя, шматлікія, але ўсе, без выключэння, удзячныя!»

І тады я каторы ўжо раз падумала: «А цікава, што было б, калі б Яўген Віктаравіч не прыйшоў тады на экзамен?»

**З. Максімава,**
*Глыбоцкі раён.*

## ХАЙ СОНЕЙКА СПІЦЬ!

...У дзяцінстве мне больш за ўсё хацелася выспацца.

Помню, у пятым класе неяк дацягнуў да нядзелі, да свайго адзінага выхаднога. Ну, думаю, зараз адарвуся — пасплю. Але ж дзе там! Мая бабуля заўсёды (нават у святы) уставала з пеўнямі, каб не проста напячы гару сваіх фірмовых бліноцаў, але і падняць на ногі ўсю нашу сям'ю — пакарміць гарачымі, бо ў халодных, казала, ужо ніякага смаку!

Мы (тата з мамай і я) з гэтым згаджаліся, мы любілі нашу галоўную гаспадыню і, вядома ж, не хацелі яе пакрыўдзіць, бо яна старалася, але...

У тую нядзелю бабуля ўжо тройчы падыходзіла да майго ложка, тройчы прамаўляла сваё: «Артусю, сонейка, уставай, прыходзь на кухню! Блінкі амаль гатовыя!.. Паеш...»

«Ну якая яда?! — праз сон думалася мне. — Якія бліны, калі я сплю яшчэ, вочы не магу прадраць, не тое, што ўстаць і некуды ісці...»

Аднак бабуля клікала. І надзей на тое, што яна пакіне мяне ў спакоі, перастане чакаць на свае бліны, больш не заставалася.

І тады... Пачакаўшы, пакуль бабуля пасля чарговай спробы падняць мяне сыдзе на кухню, я падхапіўся з ложка, на прасціну паклаў сваю скамечаную адзежу, а на падушку... футбольны мяч, усё гэта накрыў коўдрай, каб зверху выглядала, што я па-ранейшаму сплю, а сам «нырнуў» у блізкую шафу...

Бабулю доўга чакаць не давялося. Яна зноў падышла да ложка, нахілілася над маёй «галавой», завяла сваё: «Артусік, сонца маё...», акуратна адхінула краёчак коўдры і аж ускрыкнула...

Я вельмі любіў і шкадаваў сваю бабулю, але смеху стрымаць не змог!

Да яго, такога нечаканага зранку, амаль тут жа далучыліся мае бацькі, а потым і бабуля... Нарагатаўшыся, мы нарэшце селі за стол. Бліны былі вельмі ўдалыя!

...Што цікава, пасля гэтага сняданку па нядзелях мяне больш не будзілі — давалі паспаць.

**Артур Грэчка,**
*г. Віцебск.*

## НАРОД ДЛЯ РАСПУСТЫ САБРАЎСЯ...

Чым даўжэй на свеце жывеш, тым болей маеш знаёмых, прычым самых розных. Сярод маіх — быў, напрыклад, досыць модны сталічны скульптар. Ён ніколі не скардзіўся на адсутнасць заказаў. Што мяне дык трохі здзіўляла, бо тварыў ён лёгка, хутка, нібы гуляючы. І, трэба разумець, нядрэнна зарабляў?

Дык вось неяк святочным днём сустракаю я гэтага творцу ў нашым горадзе. Мы вітаемся, рукаемся... Ён, бачу, рады мне — прапануе дзенебудзь культурна пасядзець.

Ну чаму б і не? Мы з ім займаем столік. Я — гаспадар — куплю гарэлкі, шашлыкоў. Мы хораша сядзім... Госць мой, праўда, хмялее: патрабуе прадоўжыць банкет. Пытае:

— А ў вас ёсць тут прыстойны рэстаран?

Ну і далей усё як у фільме Шукшына «Каліна красная»: ці можна там зладзіць «забег ушыркі», а то ён, маўляў, дужа нервуецца: грошы ў ляжку пякуць. Іх трэба ўскалахмаціць!

Кажа вось так і пачкам купюр, як шабляй, шась у адзін бок, шась у другі...

Хоць мог бы і не размахваць, бо я ж не супраць, нават думаю, як пашчасціла: сама сталічная славутасць, пры званнях, пры грашах, запрашае мяне ў рэстаран...

Такім чынам, прыходзім мы, садзімся за столік, афіцыянт прыносіць меню. Госць мне шырокім жэстам:

— Заказвай усё што хочаш! Я — плачу.

Ні галоднымі, ні цвярозымі мы з ім ужо не былі, але ж замовілі нейкіх салатаў, мяса ў гаршчэчках, каньяку.

Потым скульптару адна жанчына спадабалася, ён бутэльку шампанскага ёй за столік папрасіў перадаць...

Карацей, мы добра пасядзелі, адпачылі так, што ўжо і стаміліся. Паклікалі афіцыянта з рахункам. Той ад слова прынёс. Скульптар тут жа выцягнуў свой пачак грошай, які так хацеў «ускалахмаціць», і мы разам з ім убачылі: там — ніводнай вялікай купюры, адна драбяза, нават за спіртное разлічыцца не хопіць!

...І гэта за шчасце яшчэ, што сядзелі мы не ў сталіцы, а ў нашым не вельмі вялікім горадзе, што ў мяне ў ім былі знаёмыя, якія таксама зайшлі ў рэстаран.

Мне, вядома ж, давялося пахадзіць ад століка да століка, з некім пашаптацца, але ж патрэбную суму я сабраў.

— Не бяры да галавы, — па дарозе на вуліцу супакойваў мяне скульптар. — Грошы табе я вярну... Ці задарма помнік зраблю.

Як і варта было чакаць, на доўг, на грошы, мой госць забыўся. А вось пра помнік, можа, і помніць яшчэ?

**Віталь Жураўскі,**
*г. Жодзіна.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

Неасабісты суб'ектыў



# Срэбная нітачка

## Пра настальгію, якая перадаецца з генамі

ПАЧАТАК вясны быў адметны дзвюма незвычайнымі завочнымі сустрэчамі. Дакладней, перапіскай у сецыве, доўгімі душэўнымі размовамі па тэлефоне (балазе, у інтэрнэце яны бясплатныя). Незвычайнае ў гэтай звычайнай для нашай рэчаіснасці гісторыі было вось што. Практычна ў адзін і той жа час і ў аднолькавай танальнасці дзве абсалютна незнаёмыя паміж сабой жанчыны з розных частак свету гаварылі аб адным і тым жа. Іх яднае толькі адно — Беларусь, у якой яны не нарадзіліся і былі два ці тры разы за ўсё жыццё. Гаварылі менавіта аб ёй, і ў абедзвюх паўтараліся словы «шкада, што...» Дзіўнае супадзенне, якое, нібы сакавіцкае пранізлівае сонца, высвеціла, яскрава паказала ў новых адценнях тое, пра што ўвогуле не задумваўся. Так бывае заўсёды, калі нешта каштоўнае маеш, а разумееш яго каштоўнасць толькі тады, калі бачыш, што ў іншых гэтага проста няма...

НАТАЛЛЯ — мая стрыечная сястра. Жыве ў Крамянчугу, на поўдні Украіны. Нарадзілася і вырасла ў Днепры (па-ранейшаму — Днепрапятроўску). Лёс закінуў ва Украіну яшчэ нашага з ёй дзеда — Васіль Клімовіч быў кадравы ваенны, пасля вайны апынуўся спачатку ў Маньчжурыі, пасля ў Запарожжы. У дзеда была іншая сям'я, але старэйшага сына, бацьку Наталлі, ён пасля заканчэння школы забраў да сябе. Дзядзька скончыў у Днепрапятроўску ўніверсітэт, працаваў на ваенным заводзе, там ажаніўся, нарадзіліся дзеці. Прыязджаў на радзіму рэдка, сям'ю прывозіў яшчэ радзей. Аднойчы, калі быў ужо ў сталым веку, прыехаў тыдні на два. Памятаю, я, тады яшчэ падлетак, са здзіўленнем назірала, як ён ірве васількі, што раслі абапал дарогі, якая вяла да яго роднай вёскі, пяшчотна гладзіць запыленыя кветкі далонню, падоўгу моўчкі глядзіць удалеч... Праз гады, у самы апошні свой прыезд, ён прызнаўся, што амаль не прыязджаў дадому, бо было вельмі балюча. Ад таго, што пакінуў, ад таго, што ўжо не вернецца, ад думак, што ўсё магло б быць інакш — прасцей, весялей, багацей, калі б застаўся на роднай зямлі.

Наташа прыязджала да нас гадоў дзесяць таму — і гэта быў яе першы прыезд на радзіму бацькі ў свядомым, не дзіцячым узросце. Яна была проста зачараваная і Мінскам, і мясцінамі, дзе нарадзіліся і выраслі нашы бацькі, ашаломленая вялікай колькасцю далёкай і блізкай радні, якая ўся жыве побач, многія нават у адным раёне. Паехала, павезла ўражанні і нашы смачныя гасцінцы, якіх тут не магла наесціся... Каторы год ужо збіраецца прыехаць яшчэ, але ўсё не атрымліваецца. Засталася ў тым далёкім горадзе практычна адна — былы муж і старэйшы сын на заробках у Польшчы, малодшы вучыцца ў Днепры, там жыве і старэнькая маці. «Шкада, што бацька з'ехаў з Беларусі, шкада, што не пераехаў пасля назад і не перавёз нас. Вам там добра, вы на сваёй зямлі і ўсе разам, нават тыя, хто на могілках. А я чым больш гадоў становіцца, тым больш адчуваю сябе адзінокай. У нас жа тут нікога няма», — роспачна гаварыла яна ў трубку вясновай сонечнай раніцай, а я яе супакойвала, казала, што між намі не такая вялікая адлегласць, што ёсць сучасныя сродкі сувязі і можна гаварыць хоць кожны дзень. Казала, а сама разумела: не тое, і суцяшэнне з маіх слоў ніякае, і слухае яна іх з прыкрасцю: маўляў, сыты галоднаму не спагадае...

І — такія супадзенні толькі ў кіно бываюць — на наступны дзень пасля нашай размовы аб'явілася Аксана. Мы з ёй пазнаёміліся трыццаць гадоў таму, калі яна прыязджала з далёкага Урала праведаць свайго дзеда, што жыў у нашай вёсцы. Мы практычна равесніцы, за тыя некалькі тыдняў не беларускіх канікул нават здружыліся, пасля нейкі нядоўгі час перапісваліся. Маці Аксаны трапіла ў тагачасны Свярдлоўск яшчэ падлеткам: чацвёра дзяцей раптоўна засталіся сіротамі без мамы і старэйшую дачку, якая якраз заканчвала школу, адправілі на Урал да роднай цёткі. Там яна і засталася, выйшла замуж, нарадзіла дзяцей. На радзіму прыязджала рэдка — не блізкі свет, дый клопатаў хапае, а цяпер ужо самой за семдзесят. Аксана была ў Беларусі два ці тры разы, апошні раз у васямнаццаць, зараз ёй ужо пад пяцьдзясят, ёсць свая сям'я, работа, наладжаны побыт... Адкуль жа тады пошук сувязяў праз трыццаць гадоў, адкуль гэта роспачнае ў першым жа пісьме, лічы, незнаёмаму чалавеку: «Вельмі шкадую, што мама паехала з Беларусі. З гадамі разумею, што мы тут фактычна адзінокія. У нас сувязь толькі праз некалькіх чалавек. Але я вельмі цёпла адношуся да вашай краіны. І ведаю, што вы ўсе ёсць. І нават самой сабе я б не магла патлумачыць гэтай любові...»

**Сёння ў экамузей «Пчалінае царства» Галіны і Аляксея ЕРМАКОВЫХ, што ў вёсцы Ржаўка Слаўгарадскага раёна, наведвальнікі прыязджаюць групамі. У сужэнцаў ёсць выразны план развіцця, па якім яны ўдасканальваюць сваю дзейнасць і прапануюць новыя формы паслуг. Гэта той выпадак, калі хобі стала справай жыцця. І дапамаглі жыхарам вёскі ў гэтым дэпутаты.**

— Аднойчы ў рамках праекта «Ад вытокаў да развіцця» быў аб'яўлены конкурс сярод мясцовых ініцыятыў, — згадвае пачатак маштабнай дзейнасці **гаспадыня сядзібы «Пчалінае царства» Галіна ЕРМАКОВА.** — Мы напісалі ініцыятыву, якую падтрымаў раённы Савет дэпутатаў, і атрымалі бязвыплатную дапамогу. На гэтыя грошы купілі мультымедыйную сістэму і афармілі кіназалу. Робім там свае прэзентацыі, знаёмім наведвальнікаў з асаблівасцямі пчол. Кожны год у нас з'яўляецца нешта новае і цікавае. Да нас прыязджаюць школьнікі і дарослыя з усёй краіны. Нам падабаецца дзяліцца ведамі, вучыць людзей збіраць мёд.

Не менш паспяховы аказаўся праект са слаўгарадскімі сыраварамі, якія сёння маюць нават свой фестываль.

стар. 3

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ


### З улікам асаблівасцяў



Да канца года ў Беларусі створаць «партрэт» кожнага раёна. стар. 3

### А як у іх?



Як спаганяюць запазычанасць з неплацельшчыкаў жыллёва-камунальных паслуг у іншых краінах. стар. 4

### Ёсць кантакт!



Як Кармянскі тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання, што на Гомельшчыне, займаецца камп'ютарным навучаннем пажылых. стар. 14

### Найлепшы староста



На Гродзеншчыне абласная асацыяцыя мясцовых Саветаў дэпутатаў падвяла вынікі конкурсу. стар. 15

### Медыцына побач з домам



У Віцебскім мікрараёне Білева на першым паверсе шматпавярхоўкі адкрылася дзіцячая амбулаторыя. стар. 16

# Заканадаўчыя ініцыятывы грамадзян заслугоўваюць увагі

**ТАКОЕ меркаванне выказала старшыня Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ, якая правяла ў Савеце Рэспублікі асабісты прыём грамадзян.**



Сярод тых, хто звярнуўся, — уласнікі мінарытарнага пакета акцый аднаго з айчынных закрытых акцыянерных таварыстваў, што працуе ў сферы гандлю, паведамілі «МС» у прэс-службе верхняй палаты беларускага парламента. Заяўнікі звярнуліся да сенатара з просьбай пасадзейнічаць у вырашэнні шэрагу пытанняў, якія датычацца дзейнасці мажарытарных акцыянераў закрытых акцыянерных таварыстваў.

— Мы хочам ведаць, каму і на якіх умовах прадаюцца акцыі, чаму не выплачваюцца дывідэнды, аднак гэтай інфармацыі нам не прадстаўляюць, — паведамілі заяўнікі і папрасілі разабрацца ў сітуацыі. Таксама яны агучылі асобныя заканадаўчыя ініцыятывы, накіраваныя на абарону правоў мінарытарных акцыянераў.

Як адзначыла Таццяна Рунец, гэтае пытанне патрабуе ўсебаковага аналізу. «Паспрабуем разабрацца ў дэталях і падрыхтуем адказ для вас, — сказала яна. — Гэта важнае пытанне, і ваш зварот па дадзенай тэматыцы не адзінкавы. Сумесна з Міністэрствам фінансаў і Міністэрствам эканомікі абмяркуем вашыя прапановы, у тым ліку ў рамках падрыхтоўкі змяненняў у Закон «Аб гаспадарчых таварыствах».

Старшыня профільнай Пастаяннай камісіі дадала, што ўсе ініцыятывы і прапановы, якія трапляюць у Савет Рэспублікі падчас асабістых прыёмаў грамадзян, уважліва вывучаюцца, а найбольш значныя — улічваюцца ў заканатворчай дзейнасці.

**Вольга АЛЯКСАНДРАВА.**

# ІДЭІ ВІТАЮЦЦА

## Асабісты прыём грамадзян правёў намеснік старшыні Савета Рэспублікі Анатоль ІСАЧАНКА

**НАВЕДВАЛЬНІКІ прыходзяць у Савет Рэспублікі па вельмі розных пытаннях. Здараецца, з зусім нечаканымі просьбамі і прапановамі, якія не знаходзяцца ў кампетэнцыі верхняй палаты беларускага парламента. Тым не менш тут кожнага чалавека імкнуцца ўважліва выслухаць, а калі няма магчымасці адразу аказаць канкрэтную дапамогу, то параіць, як і што лепш рабіць далей, куды звяртацца.**



Фота БелТА.

У гэтым сэнсе паказальны быў візіт на прыём да Анатоля Ісачанкі аднаго з няўрымслівых мінскіх вынаходнікаў-пенсіянераў, апантанага ідэяй выратавання чалавецтва ад пацяплення клімату. Яго думкі, у прыватнасці, пра стварэнне ў экватарыяльнай зоне сусветнага акіяна штучных аблокаў дзякуючы рэалізацыі яго спецыяльнага прыстасавання (макет аўтар прынёс з сабой), каб такім чынам тым самым не дапусціць страты леднікоў, былі пачутыя.

У адказ паступіла прапанова пасадзейнічаць у кантактах з супрацоўнікамі Нацыянальнай акадэміі навук, іншымі рэспубліканскімі ўстановамі, якія ўжо на прафесійным узроўні маглі б прадметна весці дыялог з вынаходнікам аб плюсах і мінусах яго плана па супрацьдзеянні адмоўнаму ўплыву сонечнай энергіі на нашу планету.

Анатоль Ісачанка потым у размове з журналістамі адзначыў, што вельмі важна падчас прыёмаў грамадзян чуць людзей, разумець іх, нават калі часам выказваюцца нестандартныя шляхі вырашэння глабальных праблем. Хто ведае, можа, яны маюць рацыю. Час пакажа.

Па словах віцэ-спікера Савета Рэспублікі, сёлета ў першым квартале ў верхнюю палату парламента паступіла больш за 500 зваротаў грамадзян па пытаннях жыллёва-камунальнай гаспадаркі, выдзялення і рэгістрацыі зямельных участкаў, падзелу маёмасці, рамонту дарог і іншых тэмах. Часта людзі звяртаюцца ў Савет Рэспублікі пасля таго, як прайшлі ўсе папярэднія інстанцыі з надзеяй на дапамогу. Таму сенатары павінны іх выслухаць і па магчымасці ў рамках заканадаўства дапамагчы, упэўнены Анатоль Ісачанка.

**Леанід ТУГАРЫН.**

# КАРЫСТАННЕ СОТКАМІ, ШУМНЫЯ СУСЕДЗІ І ЖАДАННЕ ЖЫЦЬ РАЗАМ З СЯМ'ЁЙ

## Якія пытанні прагучалі падчас прамой лініі, што правёў старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей СІВЕЦ

**У суботу, 7 сакавіка, старшыня профільнай камісіі прымаў тэлефонныя званкі падчас тэматычнай прамой лініі. За дзве гадзіны да сенатара звярнуліся 15 заяўнікаў. Што іх хвалявала? «МС» высветліла падрабязнасці.**

### Аднолькавая плата — гэта справядліва?

Адразу тры заяўнікі выказалі незадаволенасць нормай заканадаўства, згодна з якой члены садаводчага таварыства плацяць аднолькавыя членскія ўзносы, незалежна ад памераў сваіх зямельных надзелаў. Атрымліваецца, што тыя, у каго зямлі больш ці наогул некалькі ўчасткаў у адным таварыстве, і ўладальнікі аднаго невялікага лапіка зямлі павінны плаціць аднолькавыя сумы. «Ці ж гэта справядліва?» — абураюцца людзі.

Дарэчы, такая норма яшчэ ў 2015 годзе была замацавана ў адным з пунктаў Палажэння аб садаводчым таварыстве, зацверджаным адпаведным указам Прэзідэнта, у тым ліку па прапановах асобных грамадзян. Аднак, як бачым на практыцы, гэта паспрыяла незадаволенасці маламаёмасных садаводаў.

Пастаянная камісія вывучыла праблему дэталёва. Па інфармацыі Міністэрства эканомікі (а менавіта гэты орган курыруе ва ўрадзе гэтую сферу адносін. — **Аўт.**), тыя, хто звярнуўся на прамую лінію, — не адзіныя, каго хвалюе гэтае пытанне. Нязгоду з існуючым падыходам выказваюць многія. Больш за тое, на практыцы, каб пазбегнуць канфлікту паміж членамі таварыства, гэтая норма нярэдка не выконваецца.

І чым бліжэйшы надыход дачнага сезона, тым больш узнікае пытанняў у дачыненні да налічэння членскіх узносаў.

— Праблема вядомая, таму ў Мінэканоміцы ўжо падрыхтавалі праект указа, які прадугледжвае змены ў гэтай норме. Канкрэтная рэдакцыя яшчэ абмяркоўваецца. Магчыма, будзе прапанавана вярнуцца да правіла, якое дзейнічала раней: таварыства самастойна вызначае, як фарміраваць памер членскіх узносаў, на агульным сходзе. Пры гэтым крытэрыямі могуць выступаць якраз плошча і (ці) колькасць зямельных надзелаў, якія знаходзяцца ў карыстанні, — растлумачыў Сяргей Сівец.

Цяпер над гэтым працуе рабочая міжведамасная група, якая была створана ў профільным міністэрстве дзеля ўдасканалення заканадаўства аб дзейнасці садаводчых таварыстваў. У яе, дарэчы, уключаны парламентарыі, прадстаўнікі міністэрстваў, абласных выканаўчых камітэтаў, Дзяржаўнага камітэта па маёмасці.

### Ці можна цішэй?!

Лідчанін выказаў занепакоенасць тым, што ў прыватным сектары не заўсёды забяспечваецца цішыня. На яго думку, у заканадаўстве існуе прабел: з аднаго боку, нельга ноччу шумець у жылых памяшканнях. На гэта накіравана адпаведная забарона ў заканадаўстве. А з другога, што рабіць, калі суседзі бясчынстваюць адносіна на прыдамавой тэрыторыі ў раёнах прысядзібнай забудовы? Ці можна паўплываць на іх у такім выпадку? І хто гэта павінен зрабіць?

— Між іншым, праблема парушэння грамадскага спакою ў прыватным сектары хвалюе многіх. Пра гэта сведчаць шматлікія нараканні жыхароў краіны, якія выказваліся імі падчас збору прапаноў па ўдасканаленні заканадаўства аб адміністрацыйных правапарушэннях і адміністрацыйным працэсе, што праводзілі дзяржаўныя органы ў пачатку года, — адзначыў суразмоўнік.

Ён паведаміў, што Пастаянная камісія зоймецца агучанай праблемай у межах работы адпаведнай міжведамаснай экспертнай камісіі, створанай па даручэнні Прэзідэнта нашай краіны дзеля ўдасканалення заканадаўства ў гэтай сферы.

### У цэнтры ўвагі — сям'я

Падчас прамой лініі былі і тэлефанаванні ад грамадзян, якія ініцыявалі прыняцце дадатковых заканадаўчых мер па прадухіленні гвалту ў сям'і, выказвалі занепакоенасць праблемай захавання традыцыйных сямейных каштоўнасцяў. Шэраг зваротаў датычыліся садзейнічанні ў вырашэнні канкрэтных жыццёвых сітуацый, у прыватнасці, урэгулявання наступстваў самавольнага будаўніцтва на землях агульнага карыстання, а таксама засялення членаў сям'і ў інтэрнат. Аб апошнім — больш падрабязна.

Малады чалавек папрасіў сенатара дапамагчы ў выдзяленні яму сумесна з членамі яго сям'і месца ў ведамасным інтэрнаце, што знаходзіцца ў Мінску па вуліцы Бялінскага.

Справа ў тым, што хлопец працуе па размеркаванні ў адной са сталічных устаноў культуры. Сам ён атрымаў месца ў інтэрнаце, а вось для яго жонкі і дзіцяці месца не знайшлося. З аднаго боку, інтэрнат несямейны — для адзінокіх грамадзян. Але, па словах заяўніка, некаторыя ўсё ж такі жывуць тут разам са сваімі сем'ямі.

Дарэчы, заканадаўства гэтага не выключае. Так, згодна з Палажэннем аб інтэрнатах, зацверджаным Саветам Міністраў у 2013 годзе, у інтэрнатах, прызначаных для пражывання адзінокіх грамадзян, пры неабходнасці са згоды мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў можна выдзяляць ізаляваныя жылыя памяшканні для пражывання сем'яў. Гэтыя памяшканні павінны знаходзіцца на асобных паверхах ці размяшчацца ў асобных секцыях.

Як паведамілі «МС», Пастаянная камісія Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве ўзяла пытанне на кантроль, і цяпер пытанне абгрунтаванасці адмовы ў выдзяленні жылплошчы сям'і маладога чалавека прапрацоўваецца сумесна з зацікаўленымі бакамі.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

СЕНАТАРЫ ЗА РАБОТАЙ

## Без фармалізму

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ узяў удзел у пашыраным пасяджэнні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па працы і сацыяльных пытаннях, на якім разглядаўся праект закона «Аб правах інвалідаў і іх сацыяльнай інтэграцыі».**

Законапраект распрацаваны ў мэтах рэалізацыі Канвенцыі аб правах інвалідаў, ратыфікаванай нашай краінай у 2016 годзе, і накіраваны на забеспячэнне правоў і свабод людзей з інваліднасцю, павышэнне якасці іх жыцця, стварэнне належных умоў для поўнага і раўнапраўнага ўдзелу ў жыцці грамадства, паведамляе прэс-служба верхняй палаты парламента.

Сярод удзельнікаў мерапрыемства — парламентарыі, прадстаўнікі міністэрстваў працы і сацыяльнай абароны, аховы здароўя, адукацыі, інфармацыі, транспарту і камунікацый, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, архітэктуры і будаўніцтва, Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў, а таксама члены грамадскіх аб'яднанняў інвалідаў.

Падчас абмеркавання асноўных палажэнняў законапраекта, заўваг і прапаноў па ім прадстаўнікоў грамадскіх аб'яднанняў Віктар Лісковіч звярнуў увагу на недапушчальнасць фармалізму ў рабоце з людзьмі з інваліднасцю, а таксама на неабходнасць пераходу ад заяўнага прынцыпу давання льгот і гарантый да выяўляльнага.

# З улікам асаблівасцяў развіцця

## Да канца года ў Беларусі створаць «партрэт» кожнага раёна

**Да канца года кожны раён краіны распрацуе праграму свайго сацыяльна-эканамічнага развіцця на наступную пяцігодку. Прычым гэта будуць не колькасныя паказчыкі, а праекты, адаптаваныя да канкрэтных умоў з лікам мясцовых адметнасцяў і асаблівасцяў. У выніку будуць сфарміраваныя, так бы мовіць, «партрэт» рэгіёна і партфель праектаў. Такая патрэба даўно наспела. І вось чаму.**

Сёння ва ўсім свеце адбываюцца глабальныя працэсы ўрбанізацыі. Не выключэнне і Беларусь. Гэтыя працэсы адмоўна ўплываюць на раўнамернасць развіцця рэгіёнаў. Паміж імі існуе дыферэнцыяцыя ў сацыяльна-эканамічным плане. Насельніцтва і большасць рэсурсаў канцэнтруюцца ў буйных гарадах. І такая сітуацыя фарміруе пэўныя рызыкі — як эканамічныя, так і сацыяльныя, дэмаграфічныя.

— Канешне, на гэта мы павінны рэагаваць. Неабходна вызначыць меры, якія змогуць нівеліраваць сітуацыю, — лічыць **міністр эканомікі Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЧАРВЯКОЎ**. — Кожны раён мае сваю спецыялізацыю, патэнцыял — прыродны, вытворчы, сыравінны, працоўны. У кожнага ёсць свае кампетэнцыі: веды, уменне людзей прымаць тыя ці іншыя рашэнні. Усё гэта ў сукупнасці і з'яўляецца канкурэнтнай перавагай. Наша задача — выкарыстоўваць іх у далейшым як лакаматыў росту, для таго каб на іх аснове сфарміраваць бізнес-мадэлі развіцця тэрыторый, іх твар.

Напрыклад, канкурэнтная перавага Браслаўскага, Мядзельскага раёнаў у тым, што тут прыродныя ўмовы стварылі асяроддзе, цікавае турыстам, аматарам адпачынку. І гэта неабходна выкарыстоўваць максімальна. На даную сферу паслуг павінны працаваць усе астатнія галіны. У прыватнасці, транспартная — забяспечваць мабільнасць насельніцтва, яго камфорт. Будаўнічай сферы трэба арыентавацца на стварэнне адпаведнай інфраструктуры, сельскай гаспадаркі — на атрыманне экалагічна чыстай прадукцыі, развіццё фермерства.

**Намеснік старшыні Мінаблвыканкама Мікалай РАГАШЧУК** лічыць, што менавіта Мінская вобласць — адна з тых, што найбольш дынамічна развіваюцца. На працягу апошніх пяці гадоў захоўваецца станоўчая дынаміка большасці сацыяльна-эканамічных паказчыкаў.

— На Міншчыне ёсць шмат буйных прадпрыемстваў рэспубліканскай формы ўласнасці. Мы мяркуем знізіць залежнасць ад вынікаў іх дзейнасці. Таму ў праграме рэгіёнаў плануем сканцэнтравацца на развіцці камунальных і прыватных прадпрыемстваў з улікам сыравіннай базы і кадравага патэнцыялу, дэмаграфічнай сітуацыі на аснове навуковага аналізу, — канстатуе Мікалай Рагашчук.




**Раёны Мінскай вобласці плануецца раздзяліць на тры групы:**
- **аграрныя;**
- **аграпрамысловыя;**
- **прамысловыя.**

Раёны Мінскай вобласці плануецца раздзяліць на тры групы. Аграрныя — Бярэзінскі, Вілейскі, Валожынскі, Клецкі, Капыльскі, Крупскі, Любанскі, Мядзельскі, Старадарожскі, Уздзенскі і Чэрвеньскі раёны. Аграпрамысловыя — Лагойскі, Нясвіжскі, Смалявіцкі, Стаўбцоўскі раёны. Прамысловыя — Барысаўскі, Дзяржынскі, Мінскі, Маладзечанскі, Пухавіцкі, Слуцкі і Салігорскі раёны, а таксама горад Жодзіна. З цягам часу спецыялізацыя раёнаў можа мяняцца. Для распрацоўкі праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця ў Мінаблвыканкаме створана рабочая група з удзелам навукоўцаў, якая фіксуе заўвагі, прапановы, што паступаюць з месцаў.

Усе раёны цэнтральнага рэгіёна развіваюцца па-рознаму: адны стабільна, іншыя адстаюць, падкрэсліў **старшыня Мінаблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН**.

— Нельга, напрыклад, параўноўваць Дзяржынскі раён з Крупскім або Бярэзінскім, — адзначыў ён. — Таму і задачы, якія стаяць перад іх кіраўніцтвам, павінны быць дыферэнцыраваныя. Але адно агульнае, што аб'ядноўвае іх, — даходы нашых грамадзян. Менавіта гэтую сітуацыю па даходах неабходна выраўняць. У любым раёне чалавек павінен атрымліваць аднолькавыя па якасці адукацыйныя, медыцынскія і іншыя паслугі. Людзі не павінны залежаць ад транспартнай інфраструктуры, каб дабрацца на работу. Неабавязкова чалавек павінен працаваць непадалёк ад дома. Так паказвае сусветная практыка. Каб ён мог максімальна хутка дабрацца да месца сваёй работы з аднаго населенага пункта ў іншы. Таму такія базавыя прынцыпы мы заклалі ў праграму развіцця Мінскай вобласці на наступную пяцігодку.

Як сведчыць работа над комплекснай стратэгічнай праграмай рэгіянальнага развіцця, якая працягваецца два месяцы, у раёнах няма дакладнага бачання перспектыў. На думку Аляксандра Турчына, на месцах прызвычаіліся вырашаць бягучыя праблемы. А зазірнуць наперад хоць на два—тры гады не атрымліваецца.

Дарэчы, у Мінаблвыканкаме адбылася сустрэча з прадстаўнікамі раёнаў, дзе на прыкладзе аднаго з іх спецыялісты паказалі як можа развівацца аграпрамысловы комплекс. Аляксандр Турчын падкрэсліў, што пры гэтым за аснову павінна брацца эканамічная эфектыўнасць і, як вынік, добры даход грамадзян. Акрамя таго, пытанні рэгіянальнага развіцця абмяркуюць у працоўных калектывах падчас адзінага дня інфармавання ў сакавіку.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
**Інфаграфіка Аляксандра АСІПЕНКІ.**

# Скарбонка добрых спраў

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

— Падтрымка мясцовых ініцыятыў з'яўляецца асноўным кірункам эканамічнага развіцця, — лічыць **Святлана ЯЗЕРСКАЯ, старшыня Слаўгарадскага райсавета дэпутатаў**. — На выстаўцы мы прадставілі ініцыятывы, якія ўжо рэалізаваліся і працягваюць існаваць, і тыя, якія толькі з'явіліся. Тое ж сыраварства кожны год атрымлівае новыя імпульсы. Сёння, напрыклад, ствараецца рэгіянальны кластар, які будзе пашыраны і на іншыя раёны. Праектная дзейнасць — гэта перш за ўсё той інструмент, які дапамагае знайсці грошы, каб здзейсніць пажаданае. Сеткавае ўзаемадзеянне паміж пяццю раёнамі дапамагло нам прыцягнуць вялікія фінансы, што пойдуць на падтрымку ініцыятыў нашых жыхароў. Наогул у нас рэалізуецца шмат ідэй, якія ахопліваюць адразу некалькі раёнаў. Гэта яскравае сведчанне таго, што чалавек жадае і можа працаваць, яго толькі трэба падтрымаць. І ў гэтым сутнасць нашай місіі.



Пра грамадскую актыўнасць і ініцыятыўнасць было што расказаць і астатнім удзельнікам выстаўкі. Вопытам грамадскай дзейнасці дзяліліся актывісты магілёўскай школы № 45, лідары маладзёжнага парламента пры Магілёўскім гарадскім Савеце дэпутатаў, прадстаўнікі абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў. Яны генеруюць новыя ідэі і натхняюць іншых на пошукі свайго прызначэння ў жыцці. І гэты працэс бесперапынны, ахоплівае ўсё большую колькасць насельніцтва.

Сёння мала нешта зрабіць, трэба гэты вопыт замацаваць і распаўсюдзіць. І дэпутатам тут актыўна дапамагаюць сродкі масавай інфармацыі. Сярод тых, каго запрасілі ўзяць удзел у выстаўцы, было і наша выданне. Папулярнасць «МС» прыкметна набірае абароты, да нядаўняга часу яно было выключна ўкладкай «Звязды», а цяпер стала асобным штотыднёвікам. Пра супрацоўніцтва з дэпутатамі расказалі таксама прадстаўнікі тэлерадыёкампаніі «Магілёў» і інфармацыйнага агенцтва «Магілёўскія ведамасці».

З кожным годам усё больш павышаецца патрабавальнасць да дзейнасці органаў улады на месцах, а значыць, і да дэпутатаў. І каб годна прадстаўляць і абараняць інтарэсы выбаршчыкаў, народным абраннікам трэба весці актыўную работу з людзьмі. Сумеснымі дзеяннямі на месцах вырашаецца шэраг вельмі важных сацыяльна-эканамічных пытанняў. Пры падвядзенні вынікаў рэалізацыі праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця вобласці за мінулы год і работы прэзідыума абласнога Савета дэпутатаў неаднаразова падкрэслівалася важнасць ролі мясцовага кіравання і самакіравання ў вырашэнні пытанняў устойлівага развіцця тэрыторый, забеспячэння годнага ўзроўню жыцця людзей, работы з насельніцтвам і павышэння яе эфектыўнасці.

**Намеснік старшыні Магілёўскага аблсавета дэпутатаў Ірына РАІНЧЫК** звярнула ўвагу на тое, што летась праводзілася шмат пашыраных пасяджэнняў, на якіх прысутнічалі спецыялісты аблвыканкама, гарвыканкама, арганізацый вобласці. Была ўведзена практыка выступлення на сесіях, пасяджэннях прэзідыума і камісіях дэпутатаў абласавета, гарадскіх і раённых Саветаў са справаздачамі аб рабоце.

— Сёлета для больш дэталёвага разгляду пытанняў як пастаяннай камісіяй, так і прэзідыумаў неабходна праводзіць больш выязных пасяджэнняў, — заўважыла Ірына Анатолеўна. — Гэта дазволіць прымаць рашэнні, абапіраючыся на практычны вопыт рэгіёна з улікам асаблівасцяў.

Дзейнасць мясцовых Саветаў дэпутатаў была звязана з вырашэннем сацыяльных пытанняў. Летась было разгледжана больш за 30 хадайніцтваў, накіраваных на вырашэнне праблем, і пытанняў, звязаных з рэалізацыяй ініцыятыў грамадзян і органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання. На гэтыя мэты выдаткавана больш за 52 тысячы рублёў.

Вялікая работа праводзілася дэпутатамі ў выбарчых акругах. Адбылося больш за 500 прыёмаў грамадзян, частка пытанняў была вырашана, але для некаторых патрэбна доўгатэрміновая прапрацоўка, і яны знаходзяцца на кантролі.

Добрай практыкай сталі сумесныя з дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў прыёмы грамадзян на базе грамадскага прыёмнага аб'яднання «Белая Русь», дзе абмяркоўваліся ў тым ліку і законапраекты па розных сферах.

Дэпутаты адзначылі станоўчыя вынікі дзейнасці органаў мясцовага самакіравання ў вырашэнні пытанняў устойлівага развіцця тэрыторый, забеспячэння годнага ўзроўню жыцця насельніцтва, стварэння новых рабочых месцаў, уцягвання ў гаспадарчы абарот пустуючай нерухомасці і той, якая неэфектыўна выкарыстоўвалася. Яны паставілі мэту і ў далейшым садзейнічаць вырашэнню пытанняў мясцовага значэння, актыўней весці тлумачальную работу з насельніцтвам.

— Гэта трэці год, які праходзіць пад знакам малой радзімы, — падкрэсліла Ірына Раінчык. — За два гады зроблена нямала, але наперадзе яшчэ шмат работы. І Саветам трэба яшчэ больш сканцэнтравацца на пытаннях навядзення парадку на зямлі. Трэба натхніць насельніцтва на стварэнне сучаснага аблічча населеных пунктаў. Гэта павысіць камфортнасць пражывання грамадзян.

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**фота аўтара.**

# Ці вычарпальныя меры?

## Чаму не заўсёды атрымліваецца вярнуць доўг за ЖКП, і як гэтае пытанне вырашаюць у іншых краінах

**Здаецца, сёння дастаткова мер, каб спагнаць з грамадзяніна запазычанасць па аплаце жыллёва-камунальных паслуг. Тут і пастаянныя размовы, і налічэнне пені, званкі і пісьмовыя папярэджанні, прыцягненне міліцыі і падача іскавых заяў, нават высяленне і адчужэнне маёмасці. Аднак наколькі гэта эфектыўна?**

### Заканадаўства трэба карэктаваць?

Толькі мінчане на 1 студзеня 2020 года мелі запазычанасць перад камунальнымі службамі больш за шэсць мільёнаў рублёў. І паменшыць гэтую лічбу можа дапамагчы толькі змяненне заканадаўчай базы ў пэўных кірунках.

— Запазычанасць бывае як рэальная, так і фармальная, безнадзейная. Памірае шмат адзінокіх людзей, за якімі застаецца запазычанасць на асабовых рахунках дзяржаўнага жыллёвага фонду і прыватнага жылля, якое праз адсутнасць спадчыннікаў было перададзена ў камунальную ўласнасць горада, — адзначае **начальнік аддзела па спагнанні дэбіторскай запазычанасці філіяла «Адзіны разлікова-даведачны цэнтр Мінска» Эла ЛАЗАРАВА.** — І на заканадаўчым узроўні ніяк не прадугледжана спагнанне такой запазычанасці. Таксама мы не можам вярнуць доўг, калі скончыўся тэрмін дзеяння выканаўчага дакумента ці ўжо ёсць дакументы, якія пацвярджаюць, што выканаўчае вядзенне было спынена праз немагчымасць спагнання ці адсутнасць у даўжніка маёмасці, на якую гэтае спагнанне можна было б накіраваць.

Спецыялісты сталічнага АДРЦ лічаць, што існуючых сёння мер уздзеяння на грамадзян, якія маюць запазычанасць па аплаце ЖКП, сёння дастаткова. Аднак не заўсёды хапае пэўнага ўзроўню іх прымянення з боку адпаведных арганізацый і дзяржаўных органаў.

— Палегчыць работу ў гэтым кірунку магла б і інфармацыя пра месцы работы і мабільныя кантакты даўжнікоў — сёння мы не маем магчымасці іх атрымаць, — тлумачыць Эла Мікалаеўна. — А менавіта гэта дапамагло б нам урэгуляваць большасць пытанняў яшчэ да суда, і не трэба было б задзейнічаць органы прымусовага выканання, што, у сваю чаргу, таксама зацягвае працэс спагнання ці скарачэння запазычанасці.

### А як у іх?

У развітых краінах Еўразаюза з даўжнікамі па аплаце жыллёва-камунальных паслуг працуюць зусім інакш. У Міжнароднай асацыяцыі менеджменту нерухомасці (далей — МАМН) адзначаюць, што гэта звязана з дэмакратыяй, якая будуецца на двух базавых прынцыпах. Па-першае, усе правілы, у тым ліку па аплаце паслуг і спагнанні доўгу, зацвярджаюць для кожнага шматкватэрнага дома яшчэ на этапе будаўніцтва. Будучы ўласнік (або арандатар) пісьмова згаджаецца, што бярэ на сябе абавязак іх выконваць. Па-другое, калі аб'ектам з'яўляецца шматкватэрны дом з прыватнымі кватэрамі, то суб'ектам выступае якраз «аб'яднанне ўласнікаў», а не кожны ўласнік паасобку.

— Згодна з гэтымі правіламі ўласнік кватэры абавязаны пералічваць сваю частку расходаў на разліковы рахунак такога аб'яднання, якое, у сваю чаргу, аплачвае расходы пастаўшчыкоў паслуг. Запазычанасць з боку ўласніка лічыцца надзвычайным здарэннем, і кіраўнік аб'яднання адразу пачынае з ім перагаворы, — тлумачыць **член праўлення МАМН Генадзь КАЛЁНАЎ.** — І вось калі гэтыя стасункі не прыносяць пэўнага поспеху, то кіраўнік павінен ужо падаць іскавую заяву ў суд. Больш за тое, калі чалавек не плаціць за паслугі на працягу двух месяцаў і болей, то ён лічыцца ненадзейным плацельшчыкам і абавязаны потым заплаціць наперад да канца года. Калі і гэтага не робіць, то аб'яднанне можа прымусіць неплацельшчыка прадаць сваю кватэру.

Такую ж практыку выкарыстоўваюць і ў Кітаі. Цікава і тое, што ўласнікі і арандатары аплачваюць паслугі наперад роўнымі часткамі. Гэта значыць, што агульная гадавая сума падзяляецца на 12 частак, якія людзі ўносяць на рахунак аб'яднання ў першых датах разліковага месяца (у Беларусі за ЖКП плацяць не пазней за 25-е чысло месяца, які ідзе за разліковым. — **«МС»**). Пры гэтым разліковых цэнтраў і «жыровак» у Еўропе і Кітаі нават не існуе.

— Можна, канешне, разглядаць і вопыт іншых краін, але ён не будзе карысны менавіта для Беларусі, — лічыць Генадзь Генадзевіч. — Тыя ж амерыканцы ў большасці выпадкаў жывуць у прыгарадзе — у аднасямейных дамах, а ў Расіі фактычна адсутнічае сістэма прафесійнага кіравання з дакладнымі правіламі — яны пастаянна змяняюцца.

**Валерыя КІСЛАЯ.**

# ЗАПЛАЦІЦЬ НЕЛЬГА ЧАКАЦЬ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)***

Такая работа вядзецца з тымі, хто не плаціў адзін перыяд (за апошні месяц), або тымі, хто час ад часу трапляе ў гэты перыяд — аплачвае раз на некалькі месяцаў, напрыклад.

Тыя ж, хто не аплаціў запазычанасць за адзін перыяд і цягам наступнага месяца (да 25-га), становяцца ўжо «даўжнікамі наступнага ўзроўню», і метады работы з імі адпаведна змяняюцца.

— У межах прафілактычнай работы з другога месяца запазычанасці мы наведваем неплацельшчыкаў дома з папярэджаннем. У ім прапісана, якія меры іх чакаюць за неаплату, і паведамляецца, што пры непагашэнні запазычанасці мы можам накіраваць дакументы натарыусу для здзяйснення выканаўчага надпісу або звярнуцца ў суд. Гэта прадугледжана Жыллёвым кодэксам Беларусі, — растлумачыла спецыяліст. — Найперш, канешне, дзейнічаем праз натарыуса, але калі ёсць спрэчкі, то справа даходзіць да суда. Выканаўчыя надпісы або іскі ў суд па кожным даўжніку, які працяглы час не вяртае даўгі, мы здзяйсняем кожныя тры месяцы.

АРДЦ рассылае таксама лісты з паведамленнем пра даўгі ў РУУС, упраўленне адукацыі, сацыяльнай абароны, па месцы работы, каб спецыялісты гэтых устаноў таксама пасадзейнічалі спагнанню, выйшлі ў сумесныя рэйды па наведванні неплацельшчыкаў для гутарак.

### Папярэджанне, абмежаванне, высяленне

Калі аплаты няма, а тэрмін запазычанасці ўжо перавышае два месяцы, згодна з пастановай Саўміна № 1466, у цэнтры афармляюць папярэджанні аб магчымасці прыпынення камунальных паслуг. Уручыць гэты дакумент неплацельшчыкам — задача пастаўшчыка паслугі: «Водаканала», «Энергазбыту», «Мінгазу». У гэтым выпадку на аплату даўгоў даецца пяць дзён. У гэты ж час супрацоўнікі аддзела прымусовага выканання могуць пачынаць выканаўчае вядзенне ў дачыненні да даўжніка.

— Як і судовыя выканаўцы, мы таксама можам заявіць розныя хадайніцтвы: аб'явіць даўжніка ў пошук, забараніць карыстанне мабільнай сувяззю, падаць прашэнне на арышт яго аўтамабіля ці забарону выезду за мяжу (апошнія два абмежаванні — толькі па рашэнні суда), — дадала начальнік аддзела. — Калі чалавека абмяжоўваюць у праве карыстання тэлефонам ці выезду за мяжу, як правіла, даўгі пагашаюцца. Аднак гэта не працуе са злоснымі даўжнікамі.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

На тых, хто не плаціць больш за паўгода, у цэнтры рыхтуюць папярэджанне аб адчужэнні прыватнай маёмасці. Тыя ж, хто жыве ў арэндным ці сацыяльным жыллі, рызыкуюць перасяліцца ў менш прыемныя ўмовы або ўвогуле пазбавіцца жылплошчы. Уручаюць дакументы арганізацыі, якія наглядаюць за гэтай нерухомасцю (як правіла, гэта ЖРЭА раёна ці яго адміністрацыя).

Цягам года пасля вынясення судом рашэння аб адчужэнні даўжнік яшчэ можа вярнуць доўг. А вось у арандатараў ці жыхароў сацыяльнага жылля пасля ўступлення ў сілу судовага рашэння такой магчымасці ўжо, лічы, няма.

### Як становяцца даўжнікамі

Атрымаць завінавачанасць можна з розных прычын, аднак вынік іх неаплаты будзе аднолькавы.

— Рэгулярныя даўжнікі — людзі, якія плацяць раз на некалькі месяцаў, часта забываюцца зрабіць гэта, недаплачваюць поўную суму за камунальныя паслугі. Ёсць грамадзяне, якія працяглы час знаходзіліся за мяжой, лячыліся ў бальніцы, сядзелі ў турме, — акрэсліла прадстаўніца АРДЦ. — Некаторыя тлумачаць наяўнасць даўгоў затрымкай зарплаты. Яшчэ адна прычына — першачарговыя выплаты па крэдытах. Па іх жа большая пеня, таму яны важнейшыя, лічаць жыхары.

Некаторыя спасылаюцца на адсутнасць пастаяннага даходу. Часта ўласнікі проста не могуць дамовіцца паміж сабой аб аплаце, хоць пастановай Саўміна № 571 дыферэнцыруецца аплата ЖКП шляхам падзелу рахунку паміж уласнікамі. Аднак зрабіць гэта, калі ўжо існуе доўг, вельмі праблематычна, бо трэба дамаўляцца, а ніхто не хоча.

— Назапашваюць даўгі і людзі, якія не афармляюць нерухомасць своечасова ў спадчыну. Цягам сямі месяцаў з дня смерці чалавека, які адзінока пражывае, доўг множыцца па тарыфах, па якіх плаціў памерлы ўласнік, пасля — налічваецца ўжо па эканамічна абгрунтаваных тарыфах, калі ў памяшканні ніхто не зарэгістраваны, — падкрэсліла Эла Лазарава. — Даўгі накопліваюцца таксама за кошт дабораў за ваду. Калі «Водаканал» праводзіць зверку паказанняў прыбораў уліку, сума ў некаторых выпадках у адзін момант можа ўзрасці і да 1000—1500 рублёў, калі ўласнік недакладна ўказваў лічбы кубаметраў. І нейкую растэрміноўку па аплаце, як выключэнне, можа даць толькі пастаўшчык вады, хоць не абавязаны.

Каб не стаць даўжніком, калі вы надоўга (больш чым на дзесяць дзён) збіраецеся з'ехаць з кватэры, лепш загадзя папярэдзіць пра гэта разліковы цэнтр. У такім выпадку вам яшчэ і зробяць перазлік за некаторыя ЖКП — прынамсі, за вываз, абясшкоджванне адходаў, гарачую і халодную ваду, каналізацыю, газ. За апошнія тры паслугі перазлік магчымы, праўда, толькі калі ў вас няма прыбораў уліку вады і газу і вам налічваюць плацяжы па нормах спажывання.

> Каб не стаць даўжніком, калі вы надоўга (больш чым на дзесяць дзён) збіраецеся з'ехаць з кватэры, лепш загадзя папярэдзіць пра гэта разліковы цэнтр. У такім выпадку вам яшчэ і зробяць перазлік за некаторыя ЖКП.

Для гэтага неабходна падаць адпаведныя дакументы: даведку з бальніцы ці санаторыя з указаннем тэрміну знаходжання там, даведку з воінскай часці для салдат тэрміновай службы. У выпадку арэнды жылля, а таксама камандзіроўкі, вучобы, адпачынку на дачы дакументы можна ўзяць ва ўстанове, якая распараджаецца той нерухомасцю, дзе вы пэўны час жылі. Чалавек, які адбываў тэрмін зняволення, таксама можа падаць даведку аб тым, дзе знаходзіўся.

Калі ж вы былі за мяжой, то спатрэбіцца білеты ці адзнака аб выездзе за мяжу ў пашпарце або папера, якая пацвярджае ваша знаходжанне на тэрыторыі замежнай дзяржавы (на мове нашай краіны і належным чынам завераная). Апошні варыянт вельмі дарагі, а сума пераразліку літаральна некалькі рублёў, так што лепш падумаць, ці варта яно таго. Можа, лепш дамовіцца, каб вашу камуналку нехта аплачваў у вашу адсутнасць.

**Ірына СІДАРОК.**

❍ У тэму

### ЗАПАЗЫЧАНАСЦЬ — БОЛЬШ ЗА ТРЫ ТЫСЯЧЫ РУБЛЁЎ

**Памятаеце рэзанансную навіну аб знойдзенай у сталічнай кватэры памерлай адзінокай жанчыне? Мы пацікавіліся сумай доўгу.**

— Здараецца, што запазычанасць за ЖКП спагнаць так і не ўдаецца, у прыватнасці, калі з дзяржаўнага жылля чалавека высяляюць, а яго даўгі на ім застаюцца. У тэорыі ён вінен, а на практыцы зразумела, што спагнаць з яго нешта ўжо наўрад ці калі будзе магчыма. Што датычыцца прыватнага жылля, то тут яшчэ цяжэй дастукацца да свядомасці неплацельшчыка, асабліва калі ён адзінокі (бывае, што даўгі пагашаюць сваякі) і не ўпускае ў кватэру. Аналагічная сітуацыя склалася з неплацельшчыцай, якую знайшлі памерлай сёлета 14 лютага ў сталічнай кватэры. «Агульная сума доўгу на 31 студзеня гэтага года склала 3155,40 рубля. З іх доўг — 1562,79 рубля і 1592,61 — пеня. Апошні раз камунальны плацеж паступаў 25 жніўня 2017 года. З боку супрацоўнікаў нашай арганізацыі прыняты поўны комплекс мер па спагнанні запазычанасці», — пракаментавала Эла Лазарава.

Тэлесеткі

# ГЛЕБ НАШ: ГІСТОРЫЯ ЛЕГЕНДЫ




Ён — адна з яркіх зорак не толькі айчыннага, але і еўрапейскага футболу. Замежныя трэнеры і сябры па клубах у адзін голас называюць яго «крэйзі Алекс», а юныя «дынамаўцы» з захапленнем адзначаюць: лепш за ўсё на полі Аляксандр Глеб умее «тварыць цуды». Днямі ў Мінску адбыўся закрыты паказ дакументальнага фільма пра ягоную ашаламляльную кар'еру, ад «Штутгарта» да «Арсенала» і «Барселоны». Гэта прыгожая кропка: самы славуты беларускі футбаліст абвясціў аб завяршэнні кар'еры. «Футбаліст недзе ўнутры яшчэ не сышоў, але разумею: хопіць, нагуляўся. Сёлета ўжо 39, хочацца ўдзяліць увагу сям'і, дзецям... Але дакладна застануся ў футболе — хачу яго развіваць, прасоўваць, бо наш беларускі футбол пакуль што ў самым нізе», — сказаў Аляксандр.

Магчыма, падсалодзіць горкую пілюлю балельшчыкам абяцанне правесці на стадыёне «Дынама» развітальны матч, у якім плануецца сабраць топавых беларускіх і еўрапейскіх гульцоў. Але гэтай гульні давядзецца чакаць як мінімум некалькі месяцаў (самі разумееце: і арганізацыйныя складанасці, і пагрозы каранавіруса), а вось паглядзець фільм «Наш HLEB» у эфірнай версіі можна будзе ўжо 17 сакавіка на «Беларусь 1». Пашыраная, працягласцю амаль 1,5 гадзіны, яна неўзабаве з'явіцца на афіцыйным YouTube-канале Белтэлерадыёкампаніі.

«Мы працавалі над фільмам амаль год, — расказвае яго аўтар Ганна Эйсмант, — адштурхнуліся ад моманту, калі БАТЭ ў плэй-оф Лігі Еўропы згуляў з «Арсеналам». Саша, канешне, вельмі саромеўся, калі ў Лондане яго пастаянна пазнавалі балельшчыкі, ён вельмі сціплы, што мяне ўражвае ўсе гады знаёмства з ім. Але нам удалося зрабіць так, каб Саша раскаваліўся і быў самім сабой — праз гэта мноства жартаў і цікавінак засталося па-за кадрам. Затое ў фільме няма ніводнай пастановачнай сцэны і нам далі інтэрв'ю практычна ўсе важныя для Сашы людзі, якія паўплывалі на яго жыццё і кар'еру. І я спадзяюся, што нам удалося паказаць аматарам футболу рознага Глеба — вельмі простага, добрага і вясёлага, зусім не «зорнага» хлопца, такога, якім яго, магчыма, многія не ведалі».

— Ведаеце, як быццам зноў упершыню выйшаў на поле, — прызнаўся футбаліст пасля прагляду фільма «імя сябе». — Перажыў наноў самыя розныя эмоцыі, у пэўныя моманты нават слёзы падступалі... Затое дакладна будзе што расказаць і паказаць дзецям, калі яны падрастуць.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## ШАШКІ

(«Звязда») Выпуск № 109

У канцы лютага адбыўся чэмпіянат Беларусі сярод інвалідаў па зроку па шашках-100. Чэмпіёнам сярод мужчын стаў майстар спорту міжнароднага класа Дзмітрый Фадзееў — 10 ачкоў з 12 магчымых, «серабро» выйграў майстар Віктар Чыж — 8 ачкоў, бронзавая ўзнагарода ў кандыдата ў майстры Аляксандра Кур'яна — 8 ачкоў. У жаночым чэмпіянаце перамагла Марыя Лясун — 12 ачкоў з 14 магчымых. На другім месцы Віта Якімчэнка, трэцяя фінішавала Ірына Чарэднічэнка, у абедзвюх па 11 ачкоў.

Для самастойнага рашэння прапануюцца кампазіцыі ўкраінскага шашачнага кампазітара Анатоля Баланюка (г. Цепладар Адэскай вобласці).



№ 24

**Белыя простыя шашкі:** b4, f4, b6, d6, a7, c7 (6).

**Чорныя простыя шашкі:** d2, f2, c3, a5, h6, g7 (6).

№ 25

**Белыя простыя шашкі:** b4, b6, d6, c7, Белыя дамкі: b8 (5).

**Чорныя простыя шашкі:** d2, f2, c3, f4, h4, a5, e5 (7).

№ 26

**Белыя простыя шашкі:** a1, f4, g5, b6, d6, f6, a7, c7, g7 (9).

**Чорныя простыя шашкі:** b2, d2, f2, h2, c3, d4, h4, e5, h8 (10).

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

**Анонс:** З 10 да 12 красавіка ў Слоніме адбудуцца адкрытыя рэспубліканскія спаборніцтвы па шашках-64, прысвечаныя памяці братоў Мялешкаў і Мікалая Крата. Пацвярджэнне ўдзелу дасылаць не пазней за 3 красавіка на тэлефоны: 8-029-115-18-30 (Velcom), 8-033-375-18-30 (МТС) ці па e-mail: a.aniska@tut.by.

**Праверце свае рашэнні:**

Выпуск № 108 ад 28.02.20 г.

№ 20 de3, ef4, d8, e3, (b2), g5, a1+

№ 21 g5(hf4), f6(g5), bc5, e5, e1+

№ 22 1. dc3 gg7 (трэба біць большасць шашак) 2. hf8 (дамка чакае адказу чорных) bd4 3. fg1+

№ 23 1. hg5 ff2 2. ge7 ac1 3. ed8 cg5 4. dh4+

Першыя дакладныя адказы даслалі С. Рашэцін (Ашмяны), В. Дударэвіч (вёска Новая Мыш Баранавіцкага раёна), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва — Мядзел), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), А. Шурпін (Івянец), В. Ваўчкоў (Маладзечна), П. і В. Шульгі (Мінск), В. Таўкачоў (Клімавіцкі раён).

***

*Пішыце на адрас: газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, г. Мінск, 220013.*

*E-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru.*

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**

Сядзі і глядзі

# ЛЮСТЭРКА НАШЫХ ДЗЁН. ДАКУМЕНТАЛЬНАЕ

**Тэлеканал «Беларусь 3» з наступнага тыдня запрашае на кінамарафон і прапануе прагляд навінкі айчыннай дакументалістыкі вытворчасці «Беларусьфільма». Усяго гледачоў чакае 10 кінастужак, зняты ў 2019 годзе па замове Міністэрства культуры.**

Пачынаючы з 16 сакавіка па буднях у ранішнім эфіры з паўторамі ўвечары прыхільнікі дакументальнага кіно змогуць пазнаёміцца з работамі дасціпных і маладых майстроў жанру. Распачне марафон пазтычнае кінаэсэ «Месцы памяці. Іўе» (Ігара Чышчэні), прысвечанае аднаму з самабытных гарадоў нашай краіны. Менавіта тут сотні гадоў мірна суіснуюць людзі розных этнасаў і канфесій. Мячэць, касцёл, царква, сінагога даўно сталі неад'емнай часткай пейзажу гэтай мясцовасці. Горад перажыў дзве сусветныя вайны, Халакост, эміграцыю сваіх жыхароў у пошуках лепшага лёсу... А памяць аб мінулых днях захавалася ў пісьмах, на старых фотакартках, у помніках і ва ўспамінах сведкаў. У кампаніі аўтараў кінастужкі мы зможам разгледзець вобраз горада як месца памяці, духоўнага і матэрыяльнага адзінства, якое з часам і па волі людзей стала сімвалічным элементам нацыянальнай спадчыны, мінулага і сучаснага.



Фільм «Дні на вадзе» (Дзмітрыя Махамета) — аповед пра ўнікальную школу-інтэрнат па веславанні, дзе дзеці з малазабяспечаных сем'яў вёсак Мастоўскага раёна маюць магчымасць загартавацца ў спорце і атрымаць перспектыву прафесійнага росту. А вось кінаальманах «На сувязі» (рэжысёры Максім Швед, Ксенія Галубовіч, Алесь Лапо, Вераніка Бандаровіч) з'яўляецца «спробай пяра» маладых кінадакументалістаў, якія разважаюць над тэмай сацыяльнай ролі інтэрнэту ў жыцці кожнага. Навелы «У чатырох сценах», «Чаму маўчыш?», «Усе мерапрыемствы па плане» і «Патрэбныя людзі» дадуць глебу для роздумаў гледачу.

Тым, хто шукае адказ, што важнейшае сям'я ці «справа жыцця» будзе карысна паглядзець карціну «Вядо» (Галіны Адамовіч). У ёй сцэнарыст і рэжысёр знаёміць з гісторыяй пісьменніка і краязнаўцы Веніяміна Бычкоўскага, які ў 2016 годзе вырашыў пабудаваць тут капліцу на памяць пра жыхароў вёскі Вядо, што была спалена ў часы Вялікай Айчыннай вайны. Але намер зрабіць добрую справу разбурыў сям'ю мужчыны...



Зрабіць экскурс у гісторыю і ўспомніць, як фарміравалася аблічча краіны, як адраджаліся нашы святыні і будаваліся знакавыя аб'екты культуры Беларусі, можна будзе падчас прагляду іміджавай кінастужкі «Спадчына» рэжысёра Людмілы Клінцовай. Карціна наглядна дэманструе, як беларусам удалося аднавіць цэлыя пласты нацыянальнай культуры, дзякуючы якой нашу краіну цяпер ведаюць ва ўсім свеце.

Фільмы «Доктар Шуба» (рэжысёр Анатоль Алай) і «Надзея» (рэжысёр Аляксандра Маркава) — гісторыі пра людзей, якія жывуць і змагаюцца з абставінамі жыцця нягледзячы ні на што. Тут героі вельмі дакладна раскрываюцца ў сваіх учынках і дзеяннях, хоць у адным выпадку гэта лёс вядомага беларускага хірурга, а ў другім — пераадоленне і прыняцце страшных дыягназаў маладой жанчынай, мамай. У сваю чаргу, у кінакарціне «Адна сям'я» Наталля Жамойдзік звяртае ўвагу гледачоў на праблему ўсынаўлення. Двое братоў і сястра аказваюцца ў трох розных сем'ях, і няхай цяпер у кожнага свая мама, але дзеці памятаюць, што яны родныя... Як складваюцца адносіны ўсіх удзельнікаў гісторыі?..

...Паглядзець на жыццё беларусаў і ацаніць уплыў на яго народнай творчасці дасць магчымасць фільм «Фальклор і жыццё» (рэжысёр Юрый Цімафееў). Праз аўтарскае вобразнае бачанне мы дакранаемся да ўнікальных народных традыцый і абрадаў у розныя паравіны года, прычыняемся да эратычных момантаў абрадавай дзеі... Не прапусціце вандроўку на Палессе, каб даведацца падрабязнасці. А ў кінастужцы «Насця і ваўкі» Вольга Дашук раскажа гісторыю Анастасіі Кузьмянковай, якая за каханым мужам з'язджае з горада ў вёску, на хутар, і будзе там сваё жыццё. Паколькі яна па прафесіі біёлаг-арнітолаг, то ўсё складваецца вельмі гарманічна... Магчыма, убачанае натхніць і некага з нас адважыцца на перамены.

**Алена ДРАПКО.**

**Фота з сайта belarusfilm.by**

РЭПАРЦЁР

# ДАЎЖНІКОЎ ВЕДАЕМ У ТВАР

## Карэспандэнт «МС» праінспектавала ў складзе камісіі тых, хто «забывае» плаціць за камуналку

**У Магілёве сталі актыўна практыкаваць вельмі эфектыўны спосаб барацьбы з неплацельшчыкамі за камунальныя паслугі. Штомесяц супрацоўнікі разлікова-касавых цэнтраў (РКЦ) разам з прадстаўнікамі камунальных службаў ходзяць па адрасах даўжнікоў і нагадваюць пра адказнасць. Рэйды праводзяцца на працягу апошняй дэкады месяца. Карэспандэнт «МС» мела магчымасць паназіраць, як праходзіць гэты працэс перавыхавання.**

Прынцып работы камісіі такі: Магілёўскі абласны цэнтр інфармацыйных сістэм складае графік па кожным ЖЭУ і даводзіць яго да РКЦ. Уся тэрыторыя размяркоўваецца паміж спецыялістамі цэнтраў, і яны працуюць з даўжнікамі ў межах сваіх участкаў.

Таццяна Каксялава, спецыяліст па камунальных разліках РКЦ № 2, дзяўчына зусім яшчэ маладая, але вопыт уздзеяння на неплацельшчыкаў мае вялікі. Яна ўзначальвае нашу групу. Менавіта за ёй замацаваны жылы фонд гэтага і часткова дваццатага ЖЭУ. Бывае, што дзяўчына ходзіць па адрасах адна, але сёння запланавана работа камісіі, у складзе якой ёсць прадстаўнікі «Гарвадаканала», «Цеплаэнергетыкі», а таксама ЖЭУ № 15. Таццяна дэманструе спіс, дзе пазначана восем адрасоў, і мы адпраўляемся да даўжнікоў.

— Наглядна я ведаю ўсіх, хто плаціць з перабоямі, і нават у курсе, дзе кожны з іх працуе, — кажа яна. — Хутчэй за ўсё, на нашы візіты рэагуюць тыя, хто мае кароткатэрміновыя даўгі — за апошнія два месяцы. Стараемся ўручаць папярэджанні пад подпіс, як павестку, каб потым не казалі, што не бачылі. Калі не заплацілі на працягу пяці дзён, пішам лісты на работу, каб там утрымлівалі даўгі з зарплаты. Складаней з тымі, у каго запазычанасць за чатыры і болей месяцаў. Гэта, як правіла, пітушчыя, маламаёмасныя або нідзе не працуючыя людзі. Але і на іх існуюць спосабы ўздзеяння. Калі жыллё дзяржаўнае або камерцыйнае, неплацельшчыка высяляюць, а калі прыватнае, робіцца прадпісанне да адчужэння жылля, і яно выстаўляецца на таргі.

Дарэчы, хаджэнне па кватэрах звычайна адбываецца па вечарах, калі жыльцы вяртаюцца з работы і ёсць магчымасць паразмаўляць з імі. А для Таццяны Балаш, старшага кантралёра аддзела вадазбыту прадпрыемства «Магілёўаблвада», гэта яшчэ і нагода паглядзець прыбор уліку.

— Бывае, што людзі не паведамляюць у РКЦ паказанні, і ідзе запазычанасць выключна за ваду, — адзначае Таццяна. — Аднойчы запазычыліся болей чым за 300 кубоў. Як потым высветлілася, бабуля пэўны час адсутнічала, а сантэхніка была зламаная і вада лілася бескантрольна. На шчасце, такіх выпадкаў няшмат.

Даўжнікі не вельмі рады кантралёрам і не спяшаюцца адчыняць дзверы. Адзін такі кандыдат «на праправацоўку» зняў дамафонную трубку, паслухаў, хто прыйшоў, крыху пасоп і асцярожна павесіў яе назад. Дзверы адчынілі іншыя жыхары. Але ў патрэбную кватэру мы ўсё роўна не трапілі. Патапталіся каля зачыненых дзвярэй, павесілі на іх налепку, што даўжнік у спісе на адключэнне, усунулі ў шчыліну прадпісанне і пайшлі.

У наступным доме дзверы пад'езда адчыніла суседка даўжніка. Сказала, што кватэра здаецца маладой сям'і, а сам гаспадар, напэўна, забыў пракантраляваць своечасовую аплату камуналкі. Давялося таксама пакінуць у дзвярах папярэджанне.

А вось па наступным адрасе нам пашчасціла. Гаспадыня адкрыла дзверы і запрасіла зайсці. Па кватэры адразу ж было відаць, што жывуць тут не вельмі багатыя людзі. Так яно і аказалася. Жанчына адна выхоўвае двух дзяцей, адзін з якіх інвалід. Муж прапісаны па гэтым адрасе, але ўдзелу ў фінансаванні камунальных паслуг не прымае. І перабоі з аплатай здараюцца перыядычна. Зараз доўг за тры месяцы склаў 119 рублёў.

— Я ж у мінулым месяцы плаціла, — спрабуе апраўдацца жанчына.

— Вось паглядзіце, гэта ведамасць бягучай запазычанасці, — Таццяна дэманструе ёй афіцыйны дакумент. — Мы ўсёй камісіяй нагадваем, што вы павінны заплаціць 119 рублёў на працягу пяці дзён. А калі праігнаруеце, адключым паслугі. Вось распішыцеся, калі ласка, што вы папярэджаны.

Жанчына абяцае частку сумы ўнесці ўжо заўтра, але цалкам разлічыцца адразу не можа. Кажа, што аванс не такі вялікі, зарплата 400 рублёў.

— Я ж не алкашка якая, проста фінансавыя складанасці, — на вачах жанчыны выступаюць слёзы. — Надзеі на дапамогу з боку ніякай. З мужа нават аліменты спагнаць немагчыма.

Таццяна Каксялава бярэ ў жанчыны нумар мабільнага тэлефона, каб звязацца, калі абмяркуе сітуацыю са сваім кіраўніцтвам. Такіх людзей заўсёды шкада, і ім спрабуюць ісці насустрач.

Неабходна шукаць кампрамісы — калі атрымліваецца дамовіцца, праблема вырашаецца. Калі не, даводзіцца ісці на непапулярныя меры.

Чарговы выпадак якраз з гэтай оперы. За жыльцом усяго 63 рублі доўгу, але кантралёры бяруць у разлік тое, што ён ужо тры месяцы не плаціць. Пяць дзён таму чалавек атрымаў прадпісанне заплаціць за паслугі, але праігнараваў яго. Наш візіт — яго апошні шанц. Таццяна націскае кнопку званка, але за дзвярыма цішыня. Электрык ЖЭУ Дзмітрый Кандрацьеў падыходзіць да размеркавальнага электрашчыта і абясточвае кватэру. Прызнаецца, што за апошні час гэта ўжо чацвёртая кватэра, якую адключае за даўгі. Некаторыя рэагуюць на гэта і хутка разлічваюцца, а ёсць такія, хто самавольна падключаецца, бывае, нават да суседзяў. Але падобныя спробы хутка спыняюцца.

— Тэхнічны паверх, падвал, пад'езд — за ацяпленне і асвятленне ўсяго гэтага таксама трэба плаціць, але не ўсе прытрымліваюцца гэтых правіл, — абураецца Таццяна Мінакова, лабарант хімводаачысткі прадпрыемства «Цеплаэнергетыкі». — Страты назапашваюцца, і гэта кладзецца цяжкім грузам на эканоміку. Ад яго церпяць усе, у тым ліку і добрасумленныя плацельшчыкі.



**Таццяна КАКСЯЛАВА ведае сваіх даўжнікоў у твар.**



**У чарзе на высяленне.**

Тут жа пад зачыненымі дзвярыма Таццяна складае акт, куды ўносіць прозвішча членаў камісіі, і кожны пакідае ў ім свой подпіс. Вось яшчэ на аднаго кандыдата на высяленне стала болей. Бо наступны этап — гэта крайняя мера. Дарэчы, за апошні год толькі па лініі абласнога Цэнтра інфармацыйных сістэм адбылося 62 высяленні. На першага студзеня, па звестках гэтай жа службы, па Магілёве пратэрмінаванай запазычанасці агульная сума склала 1,3 мільёна рублёў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**



**Таццяна складае акт, што электрычнасць адключана за няўплату.**


**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного аукциона**

ЛОТ 1: транспортер ленточный, 2009 г. в., инв. № 5012. Начальная цена продажи лота 900 руб. (девятьсот рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 90 руб. (девяносто рублей)

ЛОТ 2: маркировочный принтер Экст-мультипринт пятиголовочный, 2015 г. в., инв. № 1789. Начальная цена продажи лота – 4 920 руб. (четыре тысячи девятьсот двадцать рубля) с учетом НДС. Сумма задатка – 492 р. (четыреста девяносто два рубля)

ЛОТ 3: принтер для яйца МАК 2-6, 2009 г. в., инв. № 5013. Начальная цена продажи лота – 4080 руб. (четыре тысячи восемьдесят рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 408 руб. (четыреста восемь рублей)

ЛОТ 4: принтер для яйца, 2007 г. в., инв. № 3072. Начальная цена продажи лота – 840 руб. (восемьсот сорок рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 84 руб. (восемьдесят четыре рубля)

